Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Ка[illegible]ная (бальшавікоў) Беларусі

ЗВЫЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 6 1933 г. ЧАЦЬВЕР № 147 (4691) Год выданьня XVI

МОСКВА, Старая Площадь 4 ЦК ВКП(б) Огр. Инстр. Отдел Янв. Дек. Зак.-1

Дэклярацыя аб стварэньні Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік

З часу стварэньня савецкіх рэспублік дзяржавы сьвету раскалоліся на два лягеры: лягер капіталізму і лягер сацыялізму.

Там, у лягеры капіталізму,—нацыянальная варожасьць і няроўнасьць, калёніяльнае рабства і шавінізм, нацыянальнае прыгнечаньне і пагромы, імпэрыялістычныя зьверствы і войны.

Тут, у лягеры сацыялізму,—узаемнае давер'е і мір, нацыянальная свабода і роўнасьць, мірнае сужыцьцё і брацкае супрацоўніцтва народаў.

Спробы капіталістычнага сьвету на працягу дзесяткаў год вырашыць пытаньне аб нацыянальнасьці шляхам сумяшчэньня свабоднага разьвіцьця народаў з сыстэмай эксплёватацыі чалавека чалавекам аказаліся бясплоднымі. Наадварот, клубок нацыянальных супярэчнасьцяй ўсё больш заблытваецца, пагражаючы самому існаваньню капіталізму. Буржуазія аказалася бясьсільнай нападзіць супрацоўніцтва народаў.

Толькі ў лягеры саветаў, толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, згуртаваўшай вакол сябе большасьць насьпеньня, аказалася магчымым зьнішчыць у корані нацыянальнае прыгнечаньне, стварыць абстаноўку ўзаемнага давер'я і закласьці аснову брацкага супрацоўніцтва народаў.

Толькі дзякуючы гэтым абставінам удалося савецкім рэспублікам адбіць напад імпэрыялістаў усяго сьвету, уну траных і зьнешніх; толькі дзякуючы гэтым абставінам удалося ім з посьпехам ліквідаваць грамадзянскую вайну, забясьпечыць сваё існаваньне і прыступіць да мірнага гаспадарчага будаўніцтва.

Апе гады вайны не прайшлі бясьсьледна. Зруйнаваныя палі, спыніўшыя працу заводы, разбураныя вытворчыя сілы і спустошаныя гаспадарчыя рэсурсы, якія засталіся ў спадчыну ад вайны, робяць невыстарчальнымі асобныя на маганьні асобных рэспублік па гаспадарчым будаўніцтве. Аднаўленьне народнай гаспадаркі аказалася немагчымым пры асобным існаваньні рэспублік.

З другога боку, няўстойлівасьць міжнароднага становішча і небясьпека новых нападаў робяць няўхільным стварэньне адзінага фронту савецкіх рэспублік перад тварам капіталістычнага акружэньня.

Урэшце, самая структура савецкай улады, інтэрнацыянальная па сваёй клясавай прыродзе, штурхае працоўныя масы савецкіх рэспублік на шлях аб'яднаньня ў адну сацыялістычную сям'ю.

Усе гэтыя абставіны настойліва патрабуюць аб'яднаньня савецкіх рэспублік у адну саюзную дзяржаву, здольную забясьпечыць і зьнешнюю бясьпечнасьць, і ўнутраны гаспадарчы посьпехі, і свабоду нацыянальнага разьвіцьця народаў.

Воля народаў савецкіх рэспублік, якія сабраліся нядаўна на зьезды сваіх саветаў і аднадушна прынялі пастанову аб стварэньні «Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік», служыць надзейнай парукай у тым, што Саюз гэты зьяўляецца дабраахвотным аб'яднаньнем роўнаправных народаў, што за кожнай рэспублікай забясьпечана права вольнага выхаду з Саюзу, што доступ у Саюз адкрыт усім сацыялістычным савецкім рэспублікам як існуючым, так і маючым узьнікнуць у будучым, што новая Саюзная дзяржава зьявіцца дастойным завяршэньнем закладзеных яшчэ ў кастрычніку 1917 г. асноў мірнага сужыцьця і брацкага супрацоўніцтва народаў, што яна паслужыць верным аплотам супроць сусьветнага капіталізму і новым рашучым крокам па шляху аб'яднаньня працоўных усіх краін у Сусьветную Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку.

ДАГАВОР АБ СТВАРЭНЬНІ САЮЗУ САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК

Расійская Сацыялістычная Федэратыўная Савецкая Рэспубліка (РСФСР), Украінская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка (УССР), Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка (БССР), Закаўказская Сацыялістычная Федэратыўная Савецкая Рэспубліка (ЗОФСР: Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Азэрбайджан, Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Грузіі і Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Арменія), Туркмэнская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка (ТуркССР), Узбэкская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка (УзССР) і Таджыкская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка (ТаджССР) яднаюцца ў адну саюзную дзяржаву — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. (20 мая 1925 г. (Зб. зак. Саюзу ССР 1925 г. № 35, ст. 245). 5 сьнежня 1929 г. (Зб. зак. Саюзу ССР № 75, ст. 717). 17 сакавіка 1931 г. (Зб. зак. Саюзу ССР 1931 г. № 17, ст. 162).

Дзесяцігодзьдзе канстытуцыі СССР

Сёньня — дзесяцігодзьдзе канстытуцыі Саюзу ССР. За паўгода да прыняцьця саюзнай канстытуцыі, а іменна 30 сьнежня 1922 г., вдылося па ініцыятыве Леніна і Сталіна стварэньне Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Першы зьезд саветаў СССР у гэты дзень прыняў і зацвердзіў дэклярацыю і дагавор аб стварэньні Саюзу ССР, прынятыя і падпісаныя напярэдадні на канфэрэнцыі паўнамочных прадстаўнікоў РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР.

Гэтыя гістарычныя даты знамянуюць вялізарнейшую перамогу ленінскай нацыянальнай палітыкі нашай партыі. Характарызуючы гістарычнае значэньне стварэньня Саюзу ССР, тав. Сталін у сваім дакладзе на 1-м зьезьдзе саветаў СССР гаварыў:

„... «Сёньнішні дзень зьяўляецца днём перамогі новай Расіі, разбуйшай панцуг нацыянальнага прыгнечаньня, арганізаваўшай перамогу над капіталам, стварыўшай дыктатуру пралетарыяту, разбудзіўшай народы Ўсходу, натхняючай рабочых Захаду, пераварыўшай чырвоны сьцяг са сьцягу партыйнага ў сьцяг дзяржаўны і згуртаваўшай вакол гэтага сьцягу народы савецкіх рэспублік для таго, каб аб'яднаць іх у адну дзяржаву, у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

У сваіх красавіцкіх тэзісах Ленін па нацыянальным пытаньні пісаў наступнае: «У нацыянальным пытаньні пралетарская партыя павінна адстойваць перш за ўсё агпашэньне і неадкладнае ажыцьцяўленьне поўнай свабоды аддзяленьня... Пралетарская партыя імкнецца да стварэньня магчыма больш буйнай дзяржавы, бо гэта выгодна для працоўных. Яна імкнецца да зблізжэньня і далейшага зьліцьця нацый, але гэтага яна хоча дасягнуць ня гвалтам, а выключна свабодным, брацкім саюзам рабочых і працоўных мас усіх нацый... Такава праграма пралетарскай рэвалюцыі», «Ажыцьцяўленьне гэтай праграмы праз рад пасьлядоўных ступеняй і прывяло да стварэньня тэй нязвычайнай арганізацыі супрацоўніцтва народаў, якая называецца Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і якая зьяўляецца жывым правобразам будучага аб'яднаньня народаў у адзінай сусьветнай гаспадарцы».

Разбурыўшы «турму народаў», пераварыўшы царскую Расію ў брацкае супрацоўніцтва працоўных усіх нацыянальнасьцяй. Кастрычніцкая рэвалюцыя карэнным чынам вырашыла нацыянальнае пытаньне ў нашай краіне. Партыя наша не абмежавалася прызнаньнем ФАРМАЛЬНАЙ РОЎНАСЬЦІ народаў, але ў аснову ўсёй сваёй нацыянальнай палітыкі паклала БАРАЦЬБУ ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ ФАКТЫЧНАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ І КУЛЬТУРНАЙ НЯРОЎНАСЬЦІ народаў, якія знаходзіліся раней у стане калёніяльнага прыгнечаньня і эксплёватацыі. Іменна гэта і характарызуе нацыянальную палітыку нашай партыі, карэнным чынам адрозьніваючы яе ад палітыкі партый II Інтэрнацыяналу па нацыянальным пытаньні, якія, дэкларуючы роўнасьць і свабоду народаў, на справе падтрымліваюць калёніяльную палітыку імпэрыялізму.

Посьпехі нацыянальнай палітыкі партыі і савецкай улады мы і выказраем галоўным чынам ступенью эканамічнага і культурнага ўздыму адстаўшых у сваім разьвіцьці народаў, ступенью ліквідацыі фактычнай іх няроўнасьці, якая засталася нам у спадчыну ад мінулага.

Каб дасягнуць хутчэйшай ліквідацыі гэтай фактычнай няроўнасьці, партыя забясьпечыла для адсталых рэспублік, вобласьцяй і раёнаў АДНОСНА БОЛЬШ ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ ЭКАНАМІЧНАГА І КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА. Гэта знайшло сваё найбольш яркае праяўленьне ў плянах першай пяцігодкі. Палітыка індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў вялізарнай меры ўмацавала эканамічную і міжнародную магутнасьць СССР у цэлым і ў той-жа час забясьпечыла нявыгадны эканамічны і культурны ўздым у раней адсталых рэспубліках і раёнах, дала магчымасьць найбольш адсталым народам савецкага Ўсходу перайсьці ад першабытных натуральных і паўнатуральных форм гаспадаркі да вышэйшых сацыялістычных форм гаспадаркі, ад пагалоўнай няпісьменнасьці да ўсеагульнай пісьменнасьці, забясьпечыла росквіт культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце.

Беларуская ССР у мінулым зьяўлялася эканамічна і культурна адсталай акраінай царскай Расіі. Прамысловасьць БССР да вайны налічвала ўсяго толькі 17 тыс. рабочых, расьсеяных да таго-ж у значнай меры па дробных паўсаматужных прадпрыемствах. Валавая прадукцыя гэтай прамысловасьці складала ўсяго толькі 40 млн. руб. У 1927 г., калі прамысловасьць усяго Савецкага Саюзу толькі падыходзіла да даваеннага ўзроўню, у прамысловасьці БССР ужо налічвалася 28 тыс. рабочых, а прамысловая прадукцыя дасягнула 160 млн. руб., г. зн. павялічылася ў чатыры разы. А за пэрыяд першай пяцігодкі прадукцыя беларускай прамысловасьці павялічылася яшчэ ў тры з паловай разы, а колькасьць занятых у ёй рабочых дасягнула 82 тысяч.

Шырокая сетка машына-трактарных станцый зьявілася магутным вагаром уздыму і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі рэспублікі, забясьпечыла поўную перамогу калгаснага ладу і разам з тым уздым матар'яльнага дабрабыту батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас. Нямала калгасаў нашай рэспублікі стаяць непасрэдна перад ажыцьцяўленьнем лёзунгу тав. Сталіна аб пераварэньні ўсіх калгаснікаў, учарайшых беднякоў і сераднякоў, у заможных.

БССР стала рэспублікай суцэльнай пісьменнасьці. Вялізарнага разьвіцьця дасягнула літаратура і мастацтва рэспублікі. БССР пакрылася шырокай сеткай ВНУ і ВТНУ, створан рад навукова-дасьледчых устаноў на чале з Акадэміяй навук, якая адыгрывае буйнейшую ролю ў сацыялістычным будаўніцтве. БССР, раней адсталая акраіна, пры дапамозе саюзнага пралетарыяту стала індустрыяльна-аграрнай перадавой рэспублікай Савецкага Саюзу.

Які кантраст са становішчам у Заходняй Беларусі, якая перажывае нячуваны заняпад эканомікі і культуры і нацыянальнае прыгнечаньне! Які кантраст са становішчам ва ўсім капіталістычным сьвеце, дзе эканамічны крызіс асабліва моцна паразіў прыгнечаныя імпэрыялізмам, эканамічна і культурна адсталыя народы.

Усе гэтыя посьпехі і перамогі нацыянальнай палітыкі партыі дасягнуты ў няпрымірнай барацьбе з «паўзучымі» ўхіламі, з ухілам да вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай для справы ўмацаваньня пралетарскага інтэрнацыяналізму і з ухілам да мясцовага нацыяналізму, адлюстроўваючага нездаваленьне аджылых клясаў раней прыгнечанай нацыянальнасьці рэжымам пралетарскай дыктатуры і іх супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню.

Пад сьцягам інтэрнацыяналізму вялікадзяржаўнікі прабуюць працягнуць рэвізію асноў ленінскай палітыкі партыі ў нацыянальным пытаньні. Яны прапавядуюць ліквідацыю нацыянальных рэспублік. Такая пропаведзь нічога агульнага з пралетарскім інтэрнацыяналізмам ня мае і зьяўляецца толькі прыкрыцьцём вялікадзяржаўніцкіх тэндэнцый, прыкрыцьцём для антысавецкіх спроб асабліць магутнасьць пралетарскай дыктатуры, дзяржаўнай формай якой і зьяўляюцца нацрэспублікі, аб'яднаныя ў Саюз.

Вялікарасійскі шавінізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай у нацыянальнай палітыцы. Гэта, аднак, ня выключае таго, што на асобных этапах, у асобных раёнах барацьба з мясцовым нацыяналізмам набывае асаблівую актуальнасьць і надзвычайнасьць. З восені мінулага году, калі рэшткі буржуазна-кулацкіх элемэнтаў прабавалі сарваць збожжазагатоўкі, з абвастрэньнем клясавай барацьбы ў краіне, мы наглядалі асаблівую актывізацыю нацдэмаўскіх элемэнтаў. Асабленьне ўвагі да нацыянальнай палітыкі, фармальнае і мэханічнае правядзеньне яе дазволілі буржуазна-нацыяналістычным элемэнтам, прапезшым у дзяржаўны апарат, і на ідэялёгічным фронце ўзьняць галаву.

Найбольш яркім праяўленьнем буржуазнага нацыяналізму і актывізацыі нацдэмаўскіх элемэнтаў зьявіліся ганебныя на настаўніка Сьцяпуру, аб чым сігналізавала «Правда», рад іншых падобных праяўленьняў мясцовага шавінізму і нацдэмаўскія выпазкі ў літаратуры (Сідарэнка-Пенэчкін, Нікановіч, Баранавых і інш.).

Побач з актывізацыяй беларускага нацдэмакратызму адбылася актывізацыя нацыяналістаў яўрэйскіх, польскіх і інш. Гэта знайшло сваё найбольш выпуклае праяўленьне ў новых спробах ідэялізаваць Бунд, як быццам рэвалюцыйна - пралетарскую арганізацыю, і які на самай справе заўсёды, ва ўвесь час свайго існаваньня, зьяўляўся правадніком меншавізму і буржуазнага нацыяналізму ў яўрэйскія рабочыя і працоўныя масы.

КП(б)Б, улічыўшы ўрокі сапраўднасьці і ўказаньні ЦК УсеКП(б), паўвінна яшчэ больш узмацніць увагу да фактычнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, да ўмацаваньня пралетарскага інтэрнацыяналізму, памятаючы, што нацыянальная палітыка зьяўляецца неадрыўнай частакай нашай агульнай барацьбы за ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры і перамогу камунізму.

СССР даў узор рэвалюцыйнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня. І наша краіна стала сьцягам для ўсіх прыгнечаных калёніяльных і паўкалёніяльных народаў у іх барацьбе супроць імпэрыялізму.

Аб мерапрыемствах па сенакашэньні і сеназагатоўках

(Пастанова бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР

Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначаюць, што масавая сенаўборка не пачата. Стварэцца непасрэдная пагроза невыкананьня пляну сенаўборкі да пачатку ўборкі збожжавых культур, што роўнасільна фактычна поўнаму зрыву пляну сенаўборкі.

Благадушныя настроі, існуючыя ў саўгастрэстах, трактарацэнтрах, раённых партыйных і савецкіх арганізацыях, сьведчаць аб неразуменьні надзвычайнай адказнасьці за своячасовае правядзеньне сенаўборкі, як рашаючай прадпасылкі для своячасовай і добраякаснай уборкі і абмалоту збожжавых і для выкананьня пляну збожжазагатовак і сеназагатовак ва ўстаноўленыя ЦК УсеКП(б) і СНК СССР тэрміны.

ЦК і СНК лічаць, што далейшае зацягваньне масавай сенаўборкі паставіць БССР перад фактам ня толькі невыкананьня пляну сенаўборкі, але і перад фактам надзвычайнай напружанасьці пры правядзеньні іншых летніх і асенніх работ, будзе мець непасрэдны ўплыў на якасьць іх выкананьня і прывядзе да вялізарных страт у сельскай гаспадарцы.

Выходзячы з таго, што кароткі час, які застаўся да пачатку ўборкі каласавых, патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў для своячасовага і поўнага выкананьня пляну сенаўборкі, ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанаўляюць:

1. Абавязаць райкомы, РВК, дырэктараў МТС і саўгасаў неадкладна пачаць масавую сенаўборку, разгарнуць вакол гэтага пытаньня шырокую палітмасавую работу сярод рабочых саўгасаў, калгаснікаў і працоўных адноасобнікаў і забясьпечыць на аснове сацспаборніцтва і барацьбы за сацыялістычнае перашынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю такія тэмпы работы па сенакашэньні, якія далі б магчымасьць бязумоўнага выкананьня пляну сенаўборкі да пачатку ўборкі збожжавых.

2. Устанавіць апошні тэрмін для сенаўборкі па БССР — 20 ліпеня з наступнай дыфэрэнцыяцыяй:

Па сыстэме Наркамзему:

Садгародтрэст—да 15 ліпеня; Лугтрэст—25; Насеннаводтрэст—15; Ільнатрактарацэнтр—20; Збожжатрактарацэнтр—15; Бульбатрактарацэнтр—15.

па сыстэме Наркамсаўгасаў:

Менскі малочна-прамысловы трэст—да 15 ліпеня; Віцебскі—15; Гомельскі—15; Птушка-трусаводтрэст—15; Магілёўскі Сьвінаводтрэст—15; Аршанскі—15, Племтрэст сьвінаводзтва—15; Менскі Сьвінаводтрэст—15.

Скасаваць, у сувязі з гэтым, усякія іншыя каляндарныя тэрміны, якія ўліваюць занальнае разьмяшчэньне сельгасвытворчасьці, а ня вытворчыя магчымасьці саўгасаў, МТС і калгасаў.

Ускласьці персанальную адказнасьць за своячасовае выкананьне пляну сенаўборкі на сакратароў райкомаў і старшынь РВК; у саўгасах і МТС — на іх дырэктараў і начальнікаў палітаддзелаў, у калгасах — на старшынь праўленьняў.

3. Устанавіць, як абавязковы мінімум прадукцыйнасьці работы сенакасілак трактарных — 150 га, конных — 75 га, грабель конных — 120-150 га.

Выходзячы з налічаных сенажатных машын і ўказаных норм выпрацоўкі, устанавіць наступны плян мэханізаванай уборкі па Наркамзему:

Садгародтрэст—65 проц.—2.800 га; Лугтрэст—43 проц.—9.200 га; Насеннаводтрэст—50 проц.—3.000 га; Ільнатрактарацэнтр—35 проц.—60.000 га; Збожжатрактарацэнтр — 20 проц. — 20.000 га; Бульбатрактарацэнтр—42 проц.—50.000 га.

ПА НАРКАМСАЎГАСАЎ!

Менскі малочна-прамысл. трэст — 38 проц.—7.000 га; Віцебскі —49 проц.—3.200 га; Гомельскі—33 проц.—7.000 га; Менскі Сьвінаводтрэст—41 проц.—4.000 га; Магілёўскі—50 проц.—4.800 га; Аршанскі—42 проц.—4.500 га; Племтрэст сьвінаводзтва—45 проц.—1.000 га; Птушка-трусаводчы трэст—32 проц.—1.000 га.

Улічваючы тое, што ўстаноўлены плян мэханізаванай сенаўборкі ня вычэрпвае вытворчай магутнасьці сенажатных машын, абавязаць РК, РВК, дырэктараў і начальнікаў палітаддзелаў саўгасаў і МТС прыняць меры да поўнага скарыстаньня машын шляхам прыстасаваньня іх на сенажацях у калгасах, якія не абслугоўваюцца МТС, і арганізаваць дапамогу саўгасам рабочай сілай з боку калгасаў за карыстаньне саўгаснымі машынамі.

Побач з гэтым у мэтах забясьпячэньня саўгасаў рабочай сілай, прапанаваць саўгастрэстам неадкладна разгарнуць работу па ўкамплектаваньні саўгасаў і вярбоўцы сезоннікаў шляхам заключэньня дагавораў з калгасамі.

Абавязаць РК і РВК аказаць усямерную дапамогу саўгасам у вярбоўцы сезоннікаў і ў стварэньні нармальных умоў для работы сезоннікаў у саўгасах.

4. Прыняць да ведама, што Наркамзем спусьціў у раён пляны па сенаўборцы, назначыў тэрміны яе і разьмеры мэханізаванай уборкі.

Прапанаваць Наркамзему ўдасканаліць заданьні раёнам па мэханізаванай уборцы, выходзячы з паказаных вышэй норм выпрацоўкі машын і дыфэрэнцыяваць тэрміны сканчэньня сенажаці па раёнах на аснове пастановы ЦК і СНК.

5. Устанавіць штодзённыя сутачныя заданьні па сенаўборцы па сыстэме Наркамзему ў цэлым — 92.300 га, у тым ліку:

па Садгародтрэсту—430 га; Лугтрэсту—660 га; Насеннаводтрэсту—440 га; Ільнатрактарацэнтру—8.010 га; Збожжатрактарацэнтру—7.300 га; Гародня-бульба-трактарацэнтру—7.300 га.

Па сыстэме Наркамсаўгасаў у цэлым — 4.100 га, у тым ліку:

па Менскім малочна-прамысл. трэсьце—1.231 га; Віцебскім—440; Гомельскім—1.050; Птушкатрэсту—180; Менскаму сьвінаводчаму трэсту—650; Магілёўскаму—650; Аршанскаму—700; Племтрэсту сьвінавод.—160 га.

Абавязаць Наркамзем і Улаўнаркамсаўгасаў забясьпечыць праз Трактарацэнтр і саўгастрэсты давядзеньне ў двухдзённы тэрмін сутачнага заданьня па сенаўборцы да раёнаў, МТС і саўгасаў.

Прапанаваць РК і РВК устанавіць анапёгічнае заданьне па сельсаветах для калгасаў і аднаасобных гаспадарак.

6. Прапанаваць саўгастрэстам, трактарацэнтрам, райкомам і РВК арганізаваць уборку сенажацяй такім чынам, каб зграбаньне сена і стогамятаньне не адрывалася ад сенакашэньня, а праходзіла ўсьлед за ім, не пазьней, чым праз 3-5 дзён пасьля скошваньня.

Лічыць абавязковай перавозку высушанага сена ў сенавалы з бліжэйшых сенакосных вучасткаў, за выключэньнем тых балот, па якіх немагчымы праезд з вазамі.

7. Абавязаць райкомы, РВК, дырэктараў і начальнікаў палітаддзелаў саўгасаў і МТС:

а) забясьпечыць захаваньне насеньнікаў сеяных траў у разьмерах, устаноўленых плянам, і своячасовае скошваньне іх на насеньне;

б) арганізаваць стражэйшую ахову скошанага сена ад раскрадаваньня як з сенажацяй, так і з сенавалаў; выпучыць для гэтай мэты спэцыяльных вартаўнікоў і абазвычыкаў і ўстанавіць дасканалы ўлік сена ў копнах, стагох і ў сенавалах;

в) у мэтах барацьбы са стратамі ўраджаю рабіць добрае падграбаньне сена, абграбаньне вазоў пры перавозцы, добрую ўкладку сена ў стагі і на высокіх астожжах у тых мясцох, дзе пагражае небясьпека затапленьня, неадкладна егароджваць стагі для захаваньня ад патраў;

г) арганізаваць грамадзкае харчаваньне на сенажацях, асабліва на асобных вучастках сенажацяй. Дазволіць саўгасам даставку на гэтыя вучасткі керосіну для снабжэньня рабочых малаком. Правесьці аналёгічныя мерапрыемствы па калгасах.

8. Абавязаць сакратароў РК, старшынь РВК, дырэктараў і начальнікаў палітаддзелаў МТС і старшынь калгасаў, старшынь сельсаветаў, пад іх асабістую адказнасьць, забясьпечыць здачу на загатоўчыя пункты Загатзбожжа ў ліпіцы пляну загатовак 1933-34 году па калгасах і аднаасобным сэктары поўнасьцю да 15 жніўня, у тым ліку ў пэрыяд сенаўборкі, г. зн. з 1-VII па 1-VIII — здаць непасрэдна з сенажаці на загатпункты Загатзбожжа ня менш 70 проц.

9. Абавязаць дырэктара Беллугтрэсту і дырэктараў яго саўгасаў вывезьці і здаць на пункты Загатзбожжа ў ліпені 5.000 тон, у жніўні — 8.000 тон, у верасьні — 5.000 тон і астатнія 9.000 тон — да 1 студзеня 1934 г., прычым з 18.000 тон, якія падлягаюць здачы да 1 кастрычніка, запрасаваць ня менш 10.000 тон.

10. Абавязаць дырэктараў і начальнікаў палітаддзелаў саўгасаў і МТС і старшынь калгасаў забясьпечыць здачу ў ліпіцы пляну выключна добраякаснага сена ня ніжэй устаноўленых сярэднябазісных кандыцый. Забараніць Загатзбожжу прымаць некандыцыйнае і балотнае сена ў ліпіцы пляну сеназагатовак.

11. Абавязаць Загатзбожжа забясьпечыць поўную захаванасьць прынятага сена ад псаваньня і арганізаваць бесьперабойнае прасоўваньне паступаючага сена з тым, каб да 1 кастрычніка было запрасавана ня менш 45.000 тон з усяго пляну прасаваньня ў 60.000 тон.

12. Абавязаць сакратароў РК, старшынь РВК і сельсаветаў неадкладна разгарнуць аргмасавую работу па здачы добраякаснага сена ва ўстаноўленыя тэрміны і аказаць неабходную садзейнасьць пугтасам Беллугтрэсту ў вывазцы сена на пункты Загатзбожжа.

13. Прасіць Улаўнаважанага НКШЗ і Наркамводу забясьпечыць Загатзбожжа чыгуначным і водным транспартам, неабходным для перавозкі сена, падлягаючага закладцы ў фонд і для снабжэньня Чырвонай арміі.

14. Абавязаць Загатзбожжа скончыць падрыхтоўку тахбазы і будаўніцтва не пазьней 10 ліпеня, забясьпечыць прыёмачныя пункты вагамі, прэсамі, дротам, шпагатам, квітанцыйнымі кніжкамі і інш. матар'ялам, неабходным для бесьперабойнай прыёмкі і прасаваньня сена; забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва сеназагатоўкамі.

15. Прапанаваць Наркампрацы не пазьней 10 ліпеня поўнасьцю забясьпечыць сеназагатоўчыя пункты Загатзбожжа прыёмшчыкамі, скірдаправамі, прасоўшчыкамі і рахункаводамі, ёрнуць у сыстэму Загатзбожжа асоб, раней працаваўшых па сену і якія знаходзяцца зараз на іншай рабоце.

РК праверыць увесь прыёмачны і інспэктарскі апарат Загатзбожжа ў раёне, ачысьціць яго ад клясава-варожых элемэнтаў і не пазьней 7 ліпеня выпучыць на пасаду раённых інспэктароў па сеназагатоўках актыўных і праверaных работнікаў.

16. Абавязаць ЦК ЛКСМБ мабілізаваць камсамольскую арганізацыю на правядзеньне сенаўборкі і сеназагатовак, выпучыўшы для гэтага максымум камсамольцаў у кожным раёне.

17. Абавязаць цэнтральныя і раённыя газэты разгарнуць кампанію за выкананьне пляну сенаўборкі і сеназагатовак, рэгулярна зьмяшчаць апэрацыйныя зводкі аб ходзе сенаўборкі і сеназагатовак, завесьці, як і ў веснавую пасеўную кампанію, чырвоныя і чорныя дошкі, даваць паказ лепшых узораў па арганізацыі ўборкі і здачы сена, бязьлітасна бічуючы абываталькія настроі і абломаўскія тэмпы ў гэтай рабоце.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

ДА УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЫ ДЫРЭКТАРОЎ МТС

7-га ліпеня адкрываецца першая ўсебеларуская нарада дырэктараў МТС.

Гэта нарада мае вялікае значэньне. Нарада заклікана абмеркаваць і практычна вырашыць важнейшыя пытаньні работы нашых машына-трактарных станцый.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА — забясьпечыць бальшавіцкае выкананьне паставак с.-г. прадукцыі дзяржаве і своячасовую — бяз страт — уборку новага ўраджаю.

МТС дасягнулі ў сваёй рабоце бясспрэчна сур'ёзных вынікаў. І гэта вынік, у першую чаргу, арганізацыі і работы палітаддзелаў.

Аднак, нашы МТС працуюць яшчэ зусім нездавальняюча. Трактарацэнтры ня зжылі старых, славесна-дэкларацыйных мэтадаў работы, не арганізавалі сапраўднага апэрацыйнага кіраўніцтва МТС.

Рэзка даюць сябе адчуваць бясплянавасьць, бясыстэмнасьць, стаўка на апартуністычны самацёк. Вазьмеце ільнатрактарацэнтр. Тут яшчэ і цяпер ня маюць ніякага ўяўленьня аб ходзе рамонту трактарнага парку па ільнаводчых МТС.

Нашы МТС перавыканалі свае пляны па сяўбе. Але гэта — ня повад для супакоенасьці. Сяўба была праведзена са значным спазьненьнем. З тым большай сілай нарада павінна вырашць памылкі, дапушчаныя пры сяўбе, каб уніжнуць іх паўтарэньня і па-бальшавіцку правесьці ўборку і пастаўку новага ўраджаю.

Урокі веснавой сяўбы яркa паказваюць, наколькі трактарацэнтры яшчэ не перабудавалі сваёй работы. Кіраўніцтва ўсьлепую, наведаньне становішча на мясцох, невыстарчальная клясавая пільнасьць прывялі да нездавальняючых вынікаў работы трактарнага парку.

Для прыкладу спынімся зноў на ільнатрактарацэнтры. Тут традыцыі славесной дэкларацыйнасьці, саноўнапанскія прыёмы кіраўніцтва прывялі да асаблівa сур'ёзных прарываў.

Вось, напрыклад, некаторыя даныя аб рабоце трактарнага парку ільнаводчых МТС за апошні месяц сяўбы. Аказваецца, трактары ня столькі працавалі, колькі стаялі. Прастоі складаюць 60,5 проц. Ганебнейшая лічба!

Па Бульбатрактарацэнтры прастоі складаюць 54,9 проц. і г. д.

І гэта — вынік выключна няправільнага, часамі проста шкодніцкага выкарыстаньня трактарнага парку. Чаго варты хоць-бы той факт, што ў графіку прычын гэтых прастояў каля 20 проц. складае... «адсутнасьць работы»?

Нарада павінна паслужыць рашаючым пераломным моментам у рабоце машына-трактарных станцый. Трэба раз і назаўсёды пакончыць са шкодніцкімі апартуністычнымі традыцыямі «міжпар'я». А што гэтыя традыцыі яшчэ ня зломлены, што яны моцна пазіраны і ў нашых МТС, красамоўна сьведчыць факт недапушчальнага запазьнаньня папаравай кампаніі.

Першага ліпеня мінуў апошні тэрмін ворыва чыстых папараў. Аднак, ні адна сыстэма трактарацэнтраў ня выканала сваіх заданьняў па ворыве.

Нельга далей цярпець такога становішча. Неадкладна завяршыць ворыва папараў, забясьпечыўшы яго высокую якасьць, скончыць праполку і прывесьці ў баявую гатоўнасьць увесь ўборачны інвэнтар, кожны трактар і машыну — вось у чым цяпер аснова асноў, вось у чым справа гонару кожнай МТС, кожнага палітаддзелу і дырэктара машына-трактарнай станцыі.

Першая запаведзь—своячасовае і поўнае выкананьне паставак с-г. прадуктаў дзяржаве. Калгасы МТС павінны паказаць прыклад у правядзеньні гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Рашучы адпор малейшым апытыдзяржаўным тэндэнцыям, малейшым спробам апушчаць дзяржаву!

Дырэктары МТС павінны забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК аб дагаворах з калгасамі. Гэтыя дагаворы маюць сілу закону і павінны быць поўнасьцю праведзены ў жыцьцё. Усё збожжа і іншыя с.-г. прадукты, якія МТС апрыходуюць ад калгасаў у аплату праведзеных с-г. работ, павінны неадкладна быць накіраваны на прыёмачныя пункты, за выключэньнем 5 проц. апрыманых прадуктаў, якія застаюцца ў распараджэньні МТС.

Асабліва трэба падкрэсьліць важнейшыя задачы, якія стаяць перад МТС па ўборцы, апрацоўцы і здачы ільну. Нарада павінна звярнуць на гэта самую сур'ёзную ўвагу.

Трэба да канца выкарыць малейшыя рэцыдывы старой контр-рэвалюцыйнай легенды аб «нерэнтабельнасьці ільнацерабілак», прывесьці ў поўную баявую гатоўнасьць кожную ільнацерабілку, падрыхтаваць кадры ільнацерабільшчыкаў з лепшых калгаснікаў-ударнікаў.

Неадкладнае завяршэньне рамонту трактарнага парку і ўборачных машын, своячасовая і высакаякасная падрыхтоўка кадраў, поўнае ажыцьцяўленьне дагавораў—вось асноўныя пытаньні, якія вырашаюць посьпех бягучага с-г. году на МТС.

Нарада павінна прайсьці пад знакам найшырэйшай мабілізацыі ўсіх сіл, усёй волі і энэргіі на ўзорнае правядзеньне паставак с-г. прадуктаў дзяржаве, на ўзорную ўборку ўраджаю!

Аб зьменах у складзе ячэйковых камісій па чыстцы Менскай партарганізацыі

Пастанова менскай гарадзкой камісіі па чыстцы КП(б)Б

Унесьці наступныя зьмены ў склад ячэйковых камісій:

а) Па групе ячэек швэйнай прамысловасьці:

Членам праверкому назначыць тав. ВЕРХАГЛЯДЗКАГА Б. Л.—член партыі з 1917 г., рабочы, кіраўнік Белканторы «Резиносбыта».

б) Па групе ячэек мэталёвай прамысловасьці:

Замест тав. Кваскова членам праверкому назначыць тав. ХАРЛАПА Д. С.—член партыі з 1921 г., селянін, дэкан факсану мэдінстытуту.

в) Па групе ячэек гарбарнай прамысловасьці:

Членам праверкому назначыць тав. ГУРЫНОВІЧА В. С.—член партыі з 1924 г., рабочы, інструктар МШУ.

г) Па групе транспартных ячэек:

Старшынёй праверкому назначыць тав. АНТОНАВА Ф. Ф.—член партыі з 1922 г., рабочы, нач. апэрацыйнага паста ДТ ДПУ.

д) Па чыстцы вясковых ячэек:

Членамі праверкомаў назначыць тав. ЛЕВІНА М. У.—член партыі з 1918 г., служачы, дырэктар Белкамунснабу, і тав. РАГАЧЭЎСКАГА К. П.—член партыі з 1920 г., рабочы, начальнік матар'яльнага складу МББ чыгуні.

* * *

Назначыць ячэйковую камісію па чыстцы вясковых ячэек Менскага раёну ў наступ

Старшыні ЦВК СССР: т. т. МУСАБЭКАЎ Газанфар (ЗСФСР), ХАДЖАЕЎ Файзула (УзССР), ЧАРВЯКОЎ А. Г. (БССР), КАЛІНІН М. І. (РСФСР), ПЯТРОЎСКІ (УССР), АЙТАКОЎ Надырбай (ТурмССР), НУСРАТУЛА Максум (ТаджССР).

А. ЧАРВЯКОЎ

Перамога ленінскай нацпалітыкі

Дзесяцігодзьдзе канстытуцыі Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік ёсьць перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Адным з найбольш яркіх прыкладаў таго, якое значэньне мела стварэньне Савецкага Саюзу, афармленае прыняцьцем цэм саюзнай канстытуцыі, для гаспадарчага і культурнага, сацыялістычнага разьвіцьця адсталых нацыянальных акраін на аснове ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, зьяўляецца Савецкая Беларусь.

Пры царызьме Беларусь была заняпалай, прыгнечанай акраінай царскай Расіі.

У сучасны момант Савецкая Беларусь зьяўляецца роўнапраўным членам Вялікага Савецкага Саюзу—Саюзнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай.

Пры царызьме Беларусь была аграрнай краінай, у якой пераважная большасьць і лепшыя землі належалі буйным памешчыкам і кулацтву; бядняцка-серадняцкія масы сялянства ўладалі горшымі землямі, у мізэрнай колькасьці і былі асуджаны на паступовае выміраньне.

У сучасны момант Савецкая Беларусь, як і ўвесь Савецкі Саюз, пры брацкай дапамозе пралетарыяту СССР, ператварыла раздробленую сельскую гаспадарку ў магутную калектывізаваную гаспадарку на базе перадавой тэхнікі, забясьпечыўшы гэтым самым базу сацыялізму ў вёсцы і ліквідаваўшы магчымасьць адначаленьня капіталізму. На аснове суцэльнай калектывізацыі кулацтва разгромлена і вядзецца бязупынная барацьба за канчатковае выкарчоўваньне рэштак капіталізму ў вёсцы.

Пры царызьме прамысловасьць у Беларусі займала нязначнае месца ў народнай гаспадарцы.

Пры магутнай дапамозе Савецкага Саюзу Савецкая Беларусь пабудавала цэлы рад буйных прамысловых прадпрыемстваў, абсталяваных паводле апошняга слову тэхнікі. Колькасьць рабочых у БССР павялічылася ў параўнаньні з дарэвалюцыйным часам у некалькі разоў, надзвычай вырасла і колькасьць прамысловай прадукцыі, Савецкая Беларусь ператварылася ў краіну Індустрыяльна-аграрную.

Беларусь да рэвалюцыі была аднэй з самых заняпалых, няпісьменных і некультурных частак царскай Расіі. У складзе Савецкага Саюзу Савецкая Беларусь пад кіраўніцтвам партыі дабілася вялізарных посьпехаў на фронце культурнага будаўніцтва. Увядзень не ўсеагульнага абавязковага навучаньня для дзяцей школьнага ўзросту, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дарослага насельніцтва, вялізарная колькасьць навучальных сярэдніх і вышэйшых устаноў, дзе рыхтуюцца пралетарскія кадры для ўсіх галін народнай гаспадаркі, буйны размах выдавецкай справы, вялізарнае разьвіцьцё мастацтва ўсіх відаў—вось канкрэтны вынік будаўніцтва культуры, пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме.

Царская Расія зьяўлялася «турмой народаў», найбольш ганебныя формы нацыянальнага прыгнечаньня мелі месца на тэрыторыі дарэвалюцыйнай Беларусі. Так званая «чарта яўрэйскай асепасьці», бавыя дружыны чорнасоценцаў, нацыяналістычныя арганізацыі беларускай, яўрэйскай, польскай, літоўскай і інш. буржуазіі, пышны росквіт значнай колькасьці дробна-буржуазных нацыяналістычных партый і арганізацый, штодзённая бязьлітасная нацыяналістычная барацьба—рабілі Беларусь арэнай нацыяналістычнай варожасьці і барацьбы, штучна арганізуемай і падтрымліваемай царскім самаўладаньнем.

Кастрычніцкая рэвалюцыя зьнішчыла самыя асновы нацыянальнай варожасьці і няроўнасьці. Савецкая Беларусь пасьля Кастрычніка, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, рашуча змагаецца за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і мае вялізарнейшыя посьпехі ў гэтай галіне. Замест нацыянальнай варожасьці і абмежаванасьці Савецкая Беларусь зьяўляецца краінай, дзе ідзе барацьба за сацыялізм на аснове інтэрнацыянальнага аб'яднаньня працоўных усіх нацыянальнасьцей.

Гэтых посьпехаў Савецкая Беларусь, як неадлучная частка Савецкага Саюзу, дамаглася дзякуючы таму, што пад кіраўніцтвам кампартыі і яе ленінскага ЦК у краіне Саветаў вырашаецца нацыянальнае пытаньне па-ленінску, на падставе зьнішчэньня ўсякай нацыянальнай няроўнасьці, на падставе ўсямернай дапамогі адсталым нацыянальнасьцям у справе іх гаспадарчага і культурнага разьвіцьця, у бязьлітаснай барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам і праявамі мясцовага шавінізму.

Значэньне ленінскай нацыянальнай палітыкі і стварэньня Савецкага Саюзу для ўсіх прыгнечаных народаў асабліва яркa выяўляецца на фоне параўнаньня становішча нацыянальных рэспублік і вобласьцей Савецкага Саюзу з нацыянальнымі часткамі, уваходзячымі ў склад капіталістычных дзяржаў.

Мінулыя 10 год зьяўляліся для ўсіх частак Савецкага Саюзу гадамі буйнага сацыялістычнага гаспадарчага і культурнага разьвіцьця.

Мінулыя 10 год для падняволеных народаў капіталістычных краін зьяўляліся гадамі далейшага пагнёбленьня эканамічнага, палітычнага і нацыянальнага прыгнечаньня.

Гэта параўнаньне выразна паказвае ўсім прыгнечаным народам, што толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, якая згуртавала вакол сябе большасьць насельніцтва, зьявілася магчымасьць зьнішчыць ушчэнт нацыянальны ўціск, стварыць абставіны ўзаемнага давер'я і закласьці аснову брацкага супрацоўніцтва народаў.

Працоўныя Савецкай Беларусі павінны адзначыць 10-гадавіну канстытуцыі Саюзу ССР яшчэ большым напружаньнем сваіх сіл для далейшага ўмацаваньня Саюзу ССР. Пры вырашэньні гэтай задачы неабходна ўлічыць увесь мінулы вопыт нашай барацьбы, трэба павесьці бязьлітасную барацьбу супроць тых недахопаў, што вызначыліся ў нашай рабоце за мінулы час.

Лепшым адзначэньнем дзесяцігодзьдзя канстытуцыі Саюзу ССР будзе сумленнае выкананьне кожным працоўным Савецкай Беларусі сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Барацьба за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за выкананьне якасных і колькасных паказальнікаў прамфінпляну — першы абавязак кожнага рабочага.

Важнейшы абавязак кожнага працоўнага перад Савецкім Саюзам у сучасны момант—пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі і свячасовая і поўная пастаўка сельгаспрадуктаў дзяржаве. У мінулым годзе імкненьне з боку кулацка-варожых элемэнтаў сарваць загатоўкі ня толькі не сустракала ўсюды свячасовага і бязьлітаснага адпору, але ў цэлым радзе выпадкаў мелі месца падтрыманьні іх з боку прымазаўшыхся і перарадзіўшыхся элемэнтаў у партыі і нашым апараце.

Мы сустракаліся з правямі гнілалібэральных адносін да зрыву выкананьня абавязкаў перад дзяржавай з правямі спавесна-дэклярацыйных адносін да барацьбы за выкананьне гэтых абавязкаў з боку асобных ячэек, саветаў, калгасаў і паасобных работнікаў. Было шмат выпадкаў, калі клясавы вораг і яго агентура ў радах партыі, прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам, вялі шапёную барацьбу супроць выкананьня абавязкаў перад дзяржавай і ня ўсюды сустракалі належнага адпору.

Усё гэта нам трэба памятаць, арганізуючы кампанію па ўборцы і пастаўцы сельгаспрадуктаў дзяржаве ў гэтым годзе. Пастаўка с.-г. прадуктаў дзяржаве ёсьць непарушны сьвяты аба вязак кожнага працуючага ў сельскай гаспадарцы, кожнага саўгасу, калгасу, МТС, кожнага калгасніка і працоўнага аднаасобніка. Лепшым доказам жаданьня і ўменьня змагацца за дыктатуру пралетарыяту, за сацыялізм, за ўзмацненьне Савецкага Саюзу будзе спужыць лепшая арганізацыя гэтай важнейшай справы, перабудова ўсёй работы саветаў у бок канкрэтнага, апэрацыйнага кіраўніцтва, выкрыцьцё і зьнішчэньне вяльможна-панскіх, гніла-лібэральных, славесна-дэклярацыйных адносін да работы.

Штодзённым абавязкам кожнага з працоўных Савецкай Беларусі павінны зьяўляцца клопаты аб узмацненьні баяздольнасьці Чырвонай арміі, аб узмацненьні абароназдольнасьці Савецкага Саюзу.

Дзякуючы посьпехам сацыялістычнага будаўніцтва, Савецкі Саюз ператварыўся ў магутную міжнародную сілу, якая цьвёрда стаіць на абароне міру.

Наш сьвяты абавязак заключаецца ў тым, каб шанаваць, як сваё вока, Савецкі Саюз ад малейшай спробы з боку ворагаў напасьці на яго. Нам трэба быць гатовымі, каб на справе ў выпадку патрэбы падмацаваць заяву тав. Сталіна аб тым, што:

«Ні аднаго вяршка чужой зямлі мы ня хочам, але і сваёй зямлі, ні аднэй пядзі сваёй зямлі не аддамо нікому».

Вялікія абавязкі ляжаць на працоўных Савецкай Беларусі ў галіне далейшага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Побач з вялізарнымі посьпехамі ў галіне ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР, у практыцы работы асобных партыйных арганізацый і савецкіх устаноў Савецкай Беларусі меўся за мінулы час цэлы рад прарываў і скажэньняў.

Справа настаўніка Сьцяпуры і цэлы рад іншых агіднейшых зьяў паказваюць, што ў БССР з прычыны невыстарчальнай бальшавіцкай пільнасьці з боку асобных партыйных і савецкіх устаноў, з прычыны недаволі рашучага змаганьня за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму, маюць месца недапушчальныя скажэньні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Нашы памылкі, несвячасовае і недаволі рашучае выкрыцьцё сутнасьці гэтых памылак, заўсёды служаць прыкрыцьцём, якім карыстаецца клясавы вораг для сваёй контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці.

Наша невыстарчальная бальшавіцкая пільнасьць прыводзіць да таго, што клясавы вораг пралазае нават у рады партыі, у саветы і, прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам, вядзе сваю контр-рэвалюцыйную работу.

Усё гэта неабходна ўлічыць пры далейшым разгортваньні практычных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Сама пабудова савецкай улады зьяўляецца інтэрнацыянальнай па сваёй клясавай прыродзе. Яна вядзе працоўныя масы савецкіх рэспублік па шляху аб'яднаньня ў адзіную сацыялістычную сям'ю.

Барацьба за ўзмацненьне і разьвіцьцё Савецкага Саюзу патрабуе ад нас яшчэ вышэй узьняць сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму, мабілізаваць усе сілы на далейшае разгорнутае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, вядучы бязьлітасную барацьбу супроць ухілаў, як у бок вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекі, так і ў бок беларускага контр рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму іншых колераў.

Трэба рашуча ачышчаць рады партыі, саветы, грамадзкія арганізацыі ад пралязючых туды клясава-варожых элемэнтаў.

Трэба павесьці рашучую ачыстку нашых радоў ад рэштак разгромленай, але недабітай беларускай нацдэмаўшчыны, якая прытаілася ў нашых установах і арганізацыях.

Пры гэтым трэба праяўляць асаблівую бальшавіцкую зоркасьць, ня верыць славесна-дэклярацыйным заявам, а патрабаваць ад кожнага доказу адданасьці партыі і савецкай уладзе на практычнай рабоце, у барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва, за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму.

Савецкая Беларусь мае вялікі гонар быць аднэй з перадавых атрадаў вялікага Савецкага Саюзу ў барацьбе за сацыялізм, вядучы гэту барацьбу на мяжы з капіталістычным сьветам.

Разам з усім Савецкім Саюзам Савецкая Беларусь сустракае дзесятую гадавіну канстытуцыі Савецкага Саюзу, завяршыўшы пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі і ўступіўшы ў другую пяцігодку — пяцігодку пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Вырашэньне задач другой пяцігодкі патрабуе яшчэ большага ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту, патрабуе яшчэ большага ўзмацненьня Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, як адзінай сацыялістычнай дзяржавы. Гэта зьяўляецца неабходнай гарантыяй для далейшага пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва, для далейшага разгорнутага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, для канчатковай перамогі ў барацьбе за сацыялізм.

Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве Усесаюзная Камуністычная Партыя і яе ленінскі Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве правадыр партыі і рабочай клясы тав. Сталін!

10 ГОД КАНСТЫТУЦЫІ СССР

Сёньня, шостага ліпеня, спаўняецца 10-я гадавіна з дня прыняцьця і ўвядзеньня ў сілу другой сэсіяй ЦВК СССР першага скліканьня асноўнага закону (канстытуцыі) Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Прыняцьцем гэтага найвялікшай важнасьці гістарычнага дакумэнту, у далейшым пацьверджанага 31-га студзеня 1924 году другім зьездам саветаў СССР, было завершана і канчаткова афармлена стварэньне Савецкага Саюзу, як адзінай саюзнай дзяржавы з тым, каб яна магла «разьвіцца ў міжнародную сілу, якая-б магла ўзьдзейнічаць на міжнародную абстаноўку, якая-б магла зьмяніць яе ў інтарэсах працоўных» (з дакладу тав. Сталіна на першым зьезьдзе саветаў СССР 30-га сьнежня 1920 году).

Прыняцьце канстытуцыі СССР і ажыўленьне ў ёй прынцыпаў супрацоўніцтва працоўных усіх нацыянальнасьцей было правазвяшчана самой сутнасьцю нацыянальнай палітыкі рабочай клясы і яе авангарду—камуністычнай партыі. Рэзалюцыя XII зьезду РКП(б) 1923 году па нацыянальным пытаньні такім чынам малюе гісторыю гэтага пытаньня.

Яшчэ ў першыя дні свайго існаваньня на першым сваім зьезьдзе (1898 г.), калі супярэчнасьці капіталізму па лініі нацыянальнага пытаньня не пасьпелі яшчэ выначыцца з вычарпальнай яснасьцю, партыя прызнала за нацыянальнасьцямі гэта неад'емнае права (г. зн. права нацый на самавызначэньне, права народаў на самастойнае дзяржаўнае існаваньне).

У далейшым яна нязьменна пацьверджала сваю нацыянальную праграму ў спэцыяльных пастановах, рашэньнях на сваіх зьездах і канфэрэнцыях аж да кастрычніцкага перавароту.

Непасрэдна напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі ў красавіку 1917 г. тав. Ленін пісаў: «у нацыянальным пытаньні пралетарская партыя павінна адстойваць перш за ўсё агаламшэньне і неадкладнае ажыцьцяўленьне поўнай свабоды аддзяленьня.

Пралетарская партыя імкнецца да стварэньня як мага большай дзяржавы, бо гэта выгодна для працоўных; яна імкнецца да зблiжэньня і далейшага зьліцьця нацый для гэтай мэты: яна хоча дасягнуць ня гвалтам, а выключна свабодным брацкім саюзам рабочых і працоўных мас усіх нацый...

Поўная свабода аддзяленьня, самая шырокая мясцовая (і нацыянальная) аўтаномія, дэтальна распрацаваныя гарантыі праў нацыянальнай меншасьці—вось праграма рэвалюцыйнага пралетарыяту» (т. XX, стар. 123).

Для ленінскага разуменьня прынцыпу самавызначэньня нацый аж да аддзяленьня надзвычай характэрна тая акалічнасьць, што гэтае аддзяленьне зьяўляецца толькі першым крокам у вырашэньні нацыянальнага пытаньня і непарыўна зьвязана з далейшым аднячэньнем на новай аснове аж да поўнага зьліцьця нацый у адно цэлае.

Вырашэньне нацыянальнага пытаньня пры дыктатуры пралетарыяту, заснаванае на самавызначэньні і роўнапраўі нацыянальнасьцей, няўхільна выклікае неабходнасьць стварэньня адзінай буйнай, устойлівай, шматнацыянальнай дзяржавы, пабудаванай на аснове добраахвотнага фэдэрацыйнага саюзу роўнапраўных нацый, на аснове пралетарскага дэмакратычнага цэнтралізму.

«...Фэдэрацыя,—пісаў Ленін у сакавіку 1918 г. (т. XXII, стар. 415-416),—калі яна праведзена ў разумных, з эканамічнага пункту погляду, межах, калі яна ўгрунтоўваецца на сур'ёзных нацыянальных адзнаках, выклікаючых сапраўдную неабходнасьць у поўнай дзяржаўнай абасобленасьці, нават фэдэрацыя ніколькі не супярэчыць дэмакратычнаму цэнтралізму... Фэдэрацыя, якую мы ўводзім і якую мы будзем уводзіць, паслужыць іменна вярнейшым крокам да самага моцнага аб'яднаньня розных нацыянальнасьцей Расіі ў адзіную дэмакратычную, цэнтралізаваную савецкую дзяржаву».

Стварэньне савецкай фэдэрацыі нельга, адзнак, разглядаць выключна з пункту погляду самавызначэньня нацыянальнасьцей. Асноўным і рашаючым момантам у стварэньні савецкай фэдэрацыі як дзяржавы была і ёсьць пабудова дзяржавы працоўных, пабудова такога саюзу нацый, які-б спрыяў умацаваньню дыктатуры пралетарыяту ў перыяд пераходу да пабудовы камуністычнага грамадзтва.

«Трэба памятаць,—сказаў тав. Сталін на XII зьезьдзе РКП(б) у 1923 г.,—што апрача права народаў на самавызначэньне ёсьць яшчэ права рабочай клясы на ўмацаваньне сваёй улады, і гэтаму вышэйшаму праву падначалена права на самавызначэньне».

Перад прыняцьцем канстытуцыі СССР адбылося зацьвярджэньне цэлага раду іншых гістарычных актаў савецкага ўраду, правядзначыўшых яе зьмест з самага пачатку існаваньня пралетарскай дыктатуры. Ужо ў першым дэкрэце савецкай улады, прынятым другім зьездам саветаў 26 кастрычніка 1917 г., аб міры без анэксій і кантрыбуцыі, гаварылася аб праве нацый на самавызначэньне.

«Дэклярацыя праў народаў Расіі», прынятая 2 лістапада 1917 г. і апублікаваная за подпісамі т. т. Леніна і Сталіна, побач з абвяшчэньнем права народаў б. царскай Расіі на самавызначэньне, падкрэсьліла таксама неабходнасьць «добрасумленнага і моцнага саюзу народаў Расіі». Толькі ў рэзультаце такога саюзу,—гаварылася ў дэклярацыі,—могуць быць згуртаваны рабочым і сялянне народаў Расіі ў адну рэвалюцыйную сілу, здольную ўстоять супроць усякіх замахаў з боку імпэрыялістка-анэксіяністкай буржуазіі».

Побач з «дэклярацыяй праў народаў Расіі» другім гістарычным актам, які ішоў перад прыняцьцем канстытуцыі і вызначыў яе зьмест, зьявілася «дэклярацыя праў працоўнага эксплёатуемага народу», зацьверджаная 3-м усерасійскім зьездам Саветаў у студзені 1918 г. У ліпені таго-ж году пяты зьезд саветаў зацьвердзіў першую Савецкую канстытуцыю — канстытуцыю РСФСР.

У поўнай адпаведнасьці з «дэклярацыяй праў народаў Расіі» часовы рабоча-сялянскі ўрад Украіны апублікаваў 28-га студзеня 1919 г. дэклярацыю аб аб'яднаньні УССР з Савецкай Расіяй на асновах сацыялістычнай фэдэрацыі.

Першага ліпеня таго-ж году, выходзячы з выказанага пажаданьня раду савецкіх рэспублік, Усерасійскі ЦВК выдае дэкрэт «аб аб'яднаньні савецкіх рэспублік Расіі—Украіны, Латвіі, Літвы і Беларусі—для барацьбы з сусьветным імпэрыялізмам». Аднак, гэта аб'яднаньне ў 1919 г. не змагло быць ажыцьцёўлена, бо тэрыторыі ўсіх паказаных савецкіх рэспублік, за выключэньнем РСФСР, былі захвачаны белымі.

Толькі ў студзені 1920 году зноў зьявілася магчымасьць, па ініцыятыве ўсеўкраінскага рэўкому, аднавіць аб'яднаньне дзейнасьці УССР і РСФСР быў заключан «саюзны рабоча-сялянскі дагавор паміж РСФСР і УССР для згуртаваньня сіл» у мэтах абароны, а таксама ў інтарэсах гаспадарчага будаўніцтва абедзьвюх рэспублік.

Сьледам за Украінай аналёгічныя дагаворы з РСФСР заключылі і іншыя савецкія рэспублікі—Азэрбайджан, Беларусь, Арменія і Грузія. Уступаючы ў ваенна-палітычны саюз з РСФСР, яны захоўвалі пры гэтым усю сваю самастойнасьць у нацыянальна-культурных адносінах.

Ужо гэтыя дагаворы абумовілі неабходнасьць у далейшым апублікаваньні афармленьня Саюзу Савецкіх Рэспублік у адным Усесаюзным дагаворы, што і было ажыцьцёўлена прыняцьцем канстытуцыі СССР 6-га ліпеня 1923 г.

Пабудова Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, як яна зафіксавана у канстытуцыі СССР, поўнасьцю асвечана на ўказаньнях Уладзімра Ільліча Леніна. Яму-ж належыць і сама назва СССР—«Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік», даная ім яшчэ ў 1919 годзе ў артыкуле «Вялікі пачын» (т. XXIV, стар. 342).

Выключная роля ў справе стварэньня СССР і ў стварэньні яго канстытуцыі належыць тав. Сталіну. Іменна тав. Сталін выступаў дакладчыкам на першым зьезьдзе саветаў СССР 30-га сьнежня 1922 г. ад імя делегацыі рэспублік, падпісаўшых дэклярацыю і дагавор аб стварэньні Саюзу ССР. Тав. Сталін выступаў таксама дакладчыкам на XII партыйным зьезьдзе ў красавіку 1923 г. па нацыянальным пытаньні і па пытаньні аб стварэньні СССР, пры чым ім дан цэлы рад асноўных палажэньняў, якія вызначаюць характар і ўвесь зьмест канстытуцыі СССР. У прыняцьці, іменна тав. Сталін унёс на XII зьезьдзе прапанову: «ў складзе саюзнага ЦВК устанавіць дзьве палаты, з якіх адна выбіралася-б на саюзным зьезьдзе саветаў незалежна ад нацыянальнасьцей, а другая палата выбіралася-б рэспублікамі і вобласьцямі (рэспубліка народу і нацыянальная вобласьць таксама народу) і зацьвярджалася-б тым-жа зьездам Саветаў Саюзу Рэспублік... Мы тады мелі-б у складзе нашых вярхоўных устаноў адлюстраваньне ня толькі клясавых інтарэсаў усіх без выключэньня пралетарскіх груп, але і запатрабаваньні цэлага ліку нацыянальных». Гэта двухпалатная структура ЦВК СССР была прынята і поўнасьцю сябе апраўдала ў далейшым.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам тав. Сталіна ў духу простых указаньняў Леніна, у поўнай адпаведнасьці з пучэньнем Маркса і Леніна была створана канстытуцыя СССР.

У канстытуцыі СССР адрымала сваё адлюстраваньне той бясспрэчны факт, што савецкая дзяржава зьяўляецца з аднаго боку формай дыктатуры пралетарыяту і з другога боку—формай добраахвотнага аб'яднаньня роўнапраўных народаў. Структура органаў савецкай улады, устаноўленая канстытуцыяй СССР, адлюстроўвае ў сабе прынцып адзінай саюзнай дзяржавы, але з поўнай гарантыяй нацыянальных інтарэсаў усіх насяляючых яе народнасьцей.

Канстытуцыя СССР замацавала ў заканадаўчым парадку роўнапраўе ўсіх 185 (паводле перапісу 1926 г.) нацыянальнасьцей Савецкага Саюзу, якія будуюць сацыялізм.

Да 10 гадавіны прыняцьця канстытуцыі СССР у сучасны момант становіць сабою магутнае дзяржаўнае аб'яднаньне 7-мі вялікіх саюзных рэспублік—19-ці аўтаномных дагаворных рэспублік і 15 аўтаномных вобласьцей. Аднак, наяўнасьць гэтых нацыянальна-тэрытарыяльных утварэньняў далёка ня вычарпваецца зазначанае канстытуцыяй СССР роўнапраўе насяляючых яго народнасьцей. Савецкая ўлада здолела вырашыць складанае пытаньне аб нацыянальным самавызначэньні распыленых нацыянальных меншасьцей у складзе паасобных рэспублік Саюзу—шляхам вылучэньнем цэлага раду нацыянальных акругаў, раёнаў і сельсаветаў. Так, напрыклад, у адной РСФСР, апрача 12 аўтаномных рэспублік, 14 аўтаномных вобласьцей, і ці зараз яшчэ 10 нацыянальных акругаў (на Поўначы), 97 нацыянальных раёнаў, каля 1700 нацыянальных сельсаветаў.

За 10 прашэдшых год усе нацыянальнасьці Савецкага Саюзу, свабодныя ў сваім нацыянальна-культурным і палітыка-эканамічным разьвіцьці, змаглі дасягнуць выключных посьпехаў на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Перш за ўсё неабходна адзначыць грандыёзны колькасны рост культурных устаноў рознага роду. Усе нацыянальныя рэспублікі і вобласьці СССР надзвычайна вырасьлі і ўмацаваліся ў эканамічных і культурных адносінах. Умацаваная дыктатура пралетарыяту. Пайшоў на выбыцьцё перажытак капіталізму—нацыяналізм. Расьце брацкая інтэрнацыянальная салідарнасьць народаў СССР.

У выніку першага 10-годзьдзя існаваньня канстытуцыі СССР мы маем у надыходзячым ні з чым нясуўмернае ўмацаваньне савецкай дзяржавы ў міжнародных адносінах. У той час як у капіталістычным сьвеце ўсё больш і больш разгараецца нацыянальная варожасьць і нарастае шалёнае імкненьне буйных імпэрыялістычных дзяржаў—драпежнікаў да заняволеньня і прыгнечаньня іншых народаў, у той час як капіталістычныя дзяржавы трапечуць на швах над нашэрам набыналага эканамічнага крызісу, — Савецкі Саюз узьвышаецца, як непрыступная скала, як магутная міжнародная сіла, цытадэля рознаплямённых, але згуртаваных у адно пралетараў, якія будуюць новы сьвет, новае сацыялістычнае грамадзтва.

А. В--скі

У БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАЛЕТАРСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ

Асноўным у нацыянальнай палітыцы нашай партыі заўсёды зьяўлялася палітыка «зблiжэньня пралетараў і поўпралетараў розных нацыянальнасьцей для сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы...».

Галоўным у ленінізьме зьяўляецца дыктатура пралетарыяту. Гэта акрэсьлівае і пранізвае ўсе бакі ленінскага вучэньня, у тым ліку і нацыянальнае пытаньне. Мы ставім нацыянальнае пытаньне ня як самастойнае, ізалятаванае пытаньне, а як падпарадкаванае галоўнаму ў ленінізьме — стварэньню і ўмацаваньню дыктатуры пралетарыяту і пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Ленінская нацыянальная палітыка — магутнейшая зброя інтэрнацыянальнага выхаваньня і згуртаваньня ўсіх працоўных. У процідзеру II Інтэрнацыяналу, носьбіту буржуазнага нацыяналізму ў рабочай клясе, які замоўчваў нацыянальнае пытаньне, прыкрываючы цем фальшывым «інтэрнацыяналізмам», які на справе асьлячаў, апраўдаў і навет праводзіў нацыянальны ўціск, — у процілегласьць яму наша партыя, імкнена выходзячы з пазыцый засьвядомага пралетарскага інтэрнацыяналізму, высоўвала як адно з важнейшых пытаньняў палітыкі пралетарыяту — нацыянальнае пытаньне.

Наша партыя з першых дзён свайго існаваньня абараняла лёзунг аб праве нацый на самавызначэньне аж да аддзяленьня іменна таму, што яна ў гэтым праве бачыла вагар зблiжэньня, аб'яднаньня і ў канчатковым выніку зьліцьця працоўных усіх народаў. Толькі прызнаньне пралетарыятам права нацый на аддзяленьне, — чыталі мы ў рэзалюцыі красавіцкай канферэнцыі нашай партыі (1917 г.), — засьведчае поўную салідарнасьць расіцкіх розных нацый і спрыяе сапраўдзе дэмакратычному зблiжэньню мас.

Разьяднаньне для злучэньня — такое найглыбейшая дыялектыка Леніна нацыянальным пытаньні. Ленін даў у гэтым пытаньні бой Розе Люксэмбург, якая пад прыкрыцьцём інтэрнацыяналізму адмаўляла права нацый на аддзяленьне і гэтым фактычна становілася на пункт гледжаньня рускага вялікадзяржаўніцтва. Ленін змагаўся супроць посьбітаў і праваслінкоў буржуазнага нацыяналізму ў рабочым асяродзішчы, супроць буржуазна-нацыяналістычных установак бунду, украінскіх сацыял-дэмакратаў, беларускіх сацыялістаў і г. д., якія стараліся ўмацоўваць існуючыя нацыянальныя перагародкі паміж працоўнымі розных нацый, супроць зблiжэньня і згуртаваньня працоўных усіх нацый.

Кастрычніцкая рэвалюцыя забясьпечыла пралетарыяту перамогу інтэрнацыяналізму, забясьпечыла «нацыянальны мір і нацыянальную свабоду», ліквідацыю да рэшты спадчыны дзікага нацыянальнага ўціску пры царызьме.

«Калі прыватная ўласнасьць і капітал няўхільна разьядноўваюць людзей, распальваюць нацыянальную рознасьць і ўзмацняюць нацыянальны ўціск, дык калектыўная ўласнасьць і праца гаксама нямінуча зблiжаюць людзей, падрываюць нацыянальную рознасьць і зьнішчаюць нацыянальны ўціск. Існаваньне капіталізму без нацыянальнага ўціску таксама німыслімa, як німыслімa і існаваньне сацыялізму без зьяўленьня прыгнечаных нацый, без нацыянальнай свабоды. Шавінізм і нацыянальная барацьба німінучы, няўхільны, пакуль сялянства (і наогул дробная буржуазія, у першую чаргу дзяржаўных нацый), поўнае нацыяналістычных забабонаў, ідзе за буржуазіяй, і, наадварот, нацыянальны мір і нацыянальную свабоду можна лічыць забясьпечанымі, калі сялянства ідзе за пралетарыятам, г. зн., калі забясьпечана дыктатура пралетарыяту. Таму перамога Саветаў і ўстанаўленьне дыктатуры пралетарыяту зьяўляецца асноўнай умовай зьнішчэньня нацыянальнага ўціску, устанаўленьня нацыянальнай 'роўнасьці, забясьпячэньня правоў нацыянальных меншасьцей» (з рэзалюцыі X зьезду аб чарговых задачах партыі ў нацыянальным пытаньні).

У «Асновах ленінізму» тав. Сталін ставіць пытаньне аб тым, што адрозьнівае ленінскі этап у пастаноўцы нацыянальнага пытаньня, што адрозьнівае прынцыпова пастаноўку нацыянальнага пытаньня Леніным, бальшавікамі, Камуністычным Інтэрнацыяналам ад пастаноўкі нацыянальнага пытаньня II Інтэрнацыяналам. У якасьці аднаго з асноўных бакоў, характарызуючых ленінскую пастаноўку нацыянальнага пытаньня і фальсыфікацыю вучэньня Маркса II Інтэрнацыяналам, тав. Сталін указвае на тое, што Ленін ставіў пытаньне аб самавызначэньні нацый аж да аддзяленьня ў процідзеру II Інтэрнацыяналу. Тав. Сталін указвае, што ленінская нацыянальная палітыка не абмяжоўваецца (у процідзеру II Інтэрнацыяналу) прызнаньнем прававой фармальнай роўнасьці нацый, а змагаецца за фактычную роўнасьць, гэта значыць ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту за поўную ліквідацыю спадчыны ранейшага ўціску і прымусу.

Для буржуазіі наогул зьяўляецца характэрным супроцьпастаўленьне роўнасьці фармальнай роўнасьці фактычнай. У сьвеце капіталістычным,—цьвердзіні буржуазныя ідэолягі на розныя лады, — пануе роўнасьць, свабода, брацтва. У сьвеце капіталістычным кожны вольны купляць і прадаваць. Рабочы столькі-ж «свабодзен» прадаваць сваю рабочую сілу, як капіталіст волен яе купляць, г. зн. эксплёатаваць. Права на сытасьць, права на асалоды гэтага сьвету ў буржуазным грамадзтве не абмежаваны. Любы бядняк мае поўнае права ня толькі быць сытым, але і стаць буйнейшым мільянэрам. Яму для гэтага не хапае толькі аднэй драбяніцы... саміх багацьцяў.

Ленін ускрывае клясавую сутнасьць гэтай буржуазнай дэмакратыі, гэтай буржуазнай роўнасьці і свабоды. Ленін выдзекуецца з буржуазнай роўнасьці галоднага з сытым, эксплёататара з эксплёатуемым. Маркс і Ленін паказваюць, наколькі сама гэта балбатня аб «роўнасьці» фармальнай зьяўляецца зброяй уціску фактычнага. Няхай бядняк супакоіцца — ён галодны, босы, разьдзеты, але-ж ён мае права быць сытым, абутым і адзетым.

І падобна да таго, як ранійя падаяліла сьвет на дзьве часткі — на сьвет сямьі і ідарства вябеснае, аддаючы апошняе пралетару, беднаку, эксплёатуемаму, каб тым ў сваю чаргу дазволілі буржуа карыстацца і распараджацца неабмежаванa «нязьменнымі» матар'яльнымі багацьцямі, — падобна да гэтага буржуазная дэмакратыя дае эксплёататару сытасьць, а эксплёатуемаму права на яе.

Гэта характэрнейшая рыса буржуазнага ашуканства, буржуазнай палітыкі пранізвае ўсе бакі буржуазнага ўціску і эксплёатацыі. І ў пытаньні нацыянальным высокапарным, урачыстыя разглагольствованьні аб прававой роўнасьці зьяўляюцца прыкрыцьцём і зброяй уціску фактычнага. Што з таго, — ужо адкрыта разважае вялікадзяржаўнік, прыгнятальнік, —што тая ці іншая адсталая нацыянальнасьць мае права на роўнасьць, калі яна ў сілу сваёй эканамічнай і культурнай адсталасьці гэтым правам фактычна карыстацца ня можа? Што з таго, што нацыі фармальна роўныя, калі фактычна ў адсталых народаў першабытная эканоміка, няма культуры, няма літаратурнай мовы і г. д.? Усё роўна яны павінны зьнікнуць, загінуць — такі закон «самой прыроды».

Тут прыходзяць ідэолягі II Інтэрнацыяналу і падзяляюць усе нацыі на культурныя і адсталыя. Нацыянальнае пытаньне, моў, мае адносіны толькі да нацый культурных, яно не датычыць нацый адсталых, паколькі яны «не дарасьлі» яшчэ да таго, каб карыстацца фармальнай роўнасьцю. Тэаратыкі II Інтэрнацыяналу апраўдваюць гэтым ограбленьне калёній імпэрыялістамі, яны апраўдваюць і прык

11-ты МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ КААПЭРАЦЫІ

Работу каапэрацыі—на ўзровень задач пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы!

За культурны савецкі гандаль, за бальшавіцкае абслугоўваньне спажыўца

Апошні год яшчэ больш абвастрыў супярэчнасьці як унутры капіталістычных краін, так і паміж імі. Да крайніх межаў скарацілася вытворчасьць і спажываньне, з кожным днём расьце зьбяднеьне вароцных мас, узмацняецца наступленьне буржуазіі на жыцьцёвы ўзровень рабочай клясы і працоўнага сялянства. Надзвычай зьнізілася купляльная здольнасьць працоўных мас капіталістычных краін.

Пры дапамозе сацыял-дэмакратыі капіталістычныя акулы павялі наступленьне на і без таго мізэрныя заваёвы каапэрацыйных арганізацый.

Каапбюракраты, асабліва ў Германіі, зрабілі ўсё магчымае, каб паставіць каапэрацыю на службу фашызму, каб вытруціць з каапэрацыйных арганізацый рэвалюцыйны дух і найменшую праву самадзейнасьці і ініцыятывы. У галіне работы каапэрацыі асабліва яскрава адлюстроўваецца здрадніцкая роля сацыял-фашыстаў. Германскія каапбюракраты сталі на калёнкі перад Гітлерам, яны перадалі яму ліст, у якім падкрэсьліваюць, што германская каапэрацыя і зараз гатова служыць інтарэсам буржуазіі.

Наступленьне капіталу па каапэрацыйным арганізацыі, як мы ўжо адзначылі, адбываецца ў абставінах няўхільнага зьніжэньня дабрабыту працоўных, няўхільнага падзеньня таваразвароту. Вось некаторыя лічбы, якія ўзятыя намі з афіцыяльных справаздач. У **Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатах** раздробны гандаль у 1932 годзе зьнізіўся да 31,5 млрд. даляраў супроць 37,5 у 1931 годзе.

Раздробны таваразварот у 1932 годзе ў **Германіі** скараціўся ў параўнаньні з 1929 годам на 37 проц. Скарачэньне адбываецца і ў бягучым годзе.

У **Англіі** раздробны таваразварот у студзені г. г. зьнізіўся ў параўнаньні са студзенем 1932 году на 6,4 проц.; у Германіі на 12,5 проц., а ў лютым ужо на 16,6 проц.

На спажывецкіх таварыствах **Польшчы** студзень даў зьніжэньне таваразвароту ў параўнаньні з мінулым годам на 18,8 проц. Вялізарнае беспрацоўе сярод рабочых і нячуванае зьбяднеьне сялянства прывялі да надзвычайнага зьмяншэньня сум пакупак і продажаў тавараў.

Акцыянэрнае аб'яднаньне германскіх спажывецкіх таварыстваў па гуртавых закупках у сваёй афіцыяльнай справаздачы аб рабоце за 1932 год прыходзіць да вельмі сумных вывадаў аб становішчы гаспадаркі і гандлю ў Германіі: «1932 год на вялікі жаль быў годам далейшага гаспадарчага заняпаду супроць 1931 году. Значна зьнізіўся прамысловы індэкс, прыметна паменшыўся грузазварот дзяржаўных чыгунак, няма ніякіх падстаў чакаць колькі-небудзь прыметнага росту прыбыткаў, а значыць і пакупальнай здольнасьці насельніцтва». Гаворачы аб перспэктывах 1933 году, аб'яднаньне прымушана прызнаць, што справа ідзе не да паляпшэньня, а наадварот да пагаршэньня становішча.

У СССР міжнародны дзень каапэрацыі сьвяткуецца ва ўмовах далейшага сацыялістычнага наступленьня на ўсіх вучастках будаўніцтва, ва ўмовах вялізарных перамог у галіне індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Мы маем вялізарныя посьпехі і ў адносінах росту таваразвароту, бо **з кожным годам няўхільна расьце матар'яльны і культурны дабрабыт рабочай клясы і ўсіх працоўных.**

Дзьве сілы процістаяць адна другой: сіла ўсямерна растучага і перамагаючага сацыялізму і сіла загніваючага, адміраючага капіталізму.

На аснове правільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі мы дабіліся вялікіх посьпехаў і ў галіне савецкага гандлю. Значна ўзрасла гандлёвая сетка. З кожным днём разьвіваецца грамадзкае харчаваньне. На радзе прадпрыемстваў створана магутная ўласная харчовая база. ЗРК і аддзелы рабочага спажываньня дабіліся раду посьпехаў у задавальненьні патрабаваньняў рабочых мас, у падпарадкаваньні сваёй работы задачам барацьбы за прамфінпляц. Уздым дабрабыту працоўных прывёў да зусім новых зьяў у галіне таваразвароту: спажывец прад'яўляе значна больш высокія патрабаваньні да якасьці, асартымэнту і цаны тавараў. Рубам пастаўлена пытаньне аб далейшай перабудове работы спажывецкай каапэрацыі, якая абслугоўвае дзесяткі мільёнаў працоўных Савецкага Саюзу.

Вось некалькі лічбаў, якія яскрава малююць тыя дасягненьні, з якімі прыходзіць спажывецкая сыстэма БССР да міжнароднага дня каапэрацыі.

Да пачатку пяцігодкі **крамная сетка спажывецкай сыстэмы** складалася з 3.065 адзінак.

На 1-ае студзеня 1933 году мы маем 5.717 — рост на 191,8 проц. За 4 месяцы 1933 году сетка зноў узрасла на 163 адзінкі.

Да пачатку першай пяцігодкі спажывецкая каапэрацыя ў БССР налічвала 706.000 пайшчыкаў. На першае студзеня 1933 году іх колькасьць павялічылася да 1.602.000 чал. — рост на 240 проц. За 5 месяцаў 1933 году колькасьць пайшчыкаў узрасла яшчэ на 38 тысяч чал.

Таваразварот складаў у першым годзе пяцігодкі 193.547 тысяч рублёў, у 1932 годзе — 455.997 тыс. — рост на 235 проц. Зварот на душу насельніцтва павялічыўся прыкладна ў 4 разы.

За мінулыя пяць год **сетка грамадзкага харчаваньня** павялічылася амаль у пясьць раз. Калі на 1-ае кастрычніка 1929 году спажывецкая сыстэма БССР мела 126 сталовак, дык па 1-га мая 1933 году мы маем 719 — рост на 570 проц. Звароты па прамадзкім харчаваньні павялічыліся за пяць год прыкладна ў 17 раз!

Якую галіну спажывецкай каапэрацыі мы ні возьмем, мы ўсюды ўбачым вялізарны рост. У пачатку першай пяцігодкі насельніцтва абслугоўвалі старыя саматужныя хлебапякарні, у нас ня было ніводнага хлебазаводу. Зараз мы маем **8 хлебазаводаў** і 4 механізаваныя майстэрні, якія далі ў 1932 годзе прадукцыі больш чым на 137 млн. рублёў.

Вынікі работы вясковай сеткі спажывецкай каапэрацыі ў часе пасеўнай кампаніі гавораць аб тым вялікім эфэкце, аб тэй вялікай карысьці, якую можа даць каапэрацыя пры ўмове правільнай перабудовы работы згодна дырэктыў партыі. Рад сельспажыўтаварыстваў і райсаюзаў крута павярнуліся тварам да задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, наблізілі сваю работу да калгасных мас і забясьпечылі пасяховае абслугоўваньне спажыўцоў.

Шмат ЗРК прыходзяць да міжнароднага дня каапэрацыі з вельмі добрым, актыўным балянсам: яны значна разгарнулі самазагатоўкі, папырылі прыгарадныя гаспадаркі, паблізілі спабжэньне да вытворчасьці, падпарадкавалі яго задачам павышэньня прадукцыйнасьці працы.

Аднак, мы ні ў якім разе ня можам абыйсьці тыя недахопы, якія ёсьць у рабоце спажывецкай каапэрацыі, у разгортваньні савецкага гандлю. **Таварныя рэшткі значна перавышаюць устаноўленыя нормы.** Яшчэ вельмі вялікімі зьяўляюцца выдаткі таваразвароту. У 1932 годзе спажывецкая сыстэма павысіла выдаткі звароту на 19,5 млн. рублёў, што складае 4,16 проц. вышэй нормы.

У радзе каапэрацыйных арганізацый яшчэ не ліквідаваны спэкуляцыйна-нэпманскія тэндэнцыі, якія праяўляюцца ў незаконным павышэньні цэн, у ігнараваньні якасьці прадукцыі, у напляваецельскіх адносінах да запатрабаваньня спажыўца. Мы маем факты дрэннага абслугоўваньня пайшчыкаў, што зьяўляецца вынікам няўменьня і нежаданьня гандляваць па-савецку, па-бальшавіцку абслугоўваць узрастаючыя запатрабаваньні рабочых мас.

Толькі сапраўды бальшавіцкая перабудова работы, разгортваньне культурнага савецкага гандлю, ачышчэньне каапэрацыі ад чужых, перараджэнцкіх, спэкуляцыцкіх элемэнтаў ад самаснабжэнцаў, растратчыкаў і раскрадальнікаў грамадзкай маемасьці— асноўныя ўмовы далейшых посьпехаў каапэрацыі.

Мы зараз уступілі ў самы адказны перыяд сельска-гаспадарчых работ: по ліва і ўборкі. Ад выпікаў уборачнай кампаніі залежыць выкананьне важнейшых народна-гаспадарчых плянаў.

Партыя сканцэнтроўвае ўсе сілы, усю сваю ўвагу на пераможным правядзеньні ўборкі і загатовак. Вясковая сыстэма спажывецкай каапэрацыі абавязана забясьпечыць ударнае абслугоўваньне ўборкі і загатовак шляхам разгортваньня савецкага гандлю, набліжэньня яго да працоўных мас. **Спажывецкая каапэрацыя БССР у другім этапе конкурсу на лепшае сельспажыўтаварыства ўступіла ў сацспаборніцтва са спажывецкай сыстэмай Заходняй вобласьці.** Наша задача — падхапіць вопыт перадавых райсаюзаў і сельспажыўтаварыстваў і заваяваць першынства ў сацспаборніцтве.

ЦК КП(б)Б па дакладу двух сельспажыўтаварыстваў Касьцюковіцкага раёну даў зусім правільную рэкую ацэнку работы спажывецкай каапэрацыі зьверху данізу, асабліва ў адносінах кіраўніцтва нізоўкай. ЦК КП(б)Б зваліфікаваў гэта кіраўніцтва, як «сапоўна-панскія адносіны». Абавязак усёй сыстэмы спажывецкай каапэрацыі—забясьпечыць усе вучасткі работы штодзённым, сыстэматычным апэрацыйным і жывым кіраўніцтвам.

Сьвята каапэрацыі праходзіць у нас у абставінах няўхільнага росту сацыялістычнай гаспадаркі, які зьяўляецца вынікам правільнага кіраўніцтва Ленінскай партыяй і яе ЦК на чале з тав. **Сталіным.** Гэтыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва стварылі ўсе ўмовы для далейшага разьвіцця і паскарэньня таваразвароту, далейшага паляпшэньня спабжэньня рабочых і калгасных мас.

«Зрабіць гэты год апошнім годам цяжкасьцяй, гэта такая задача, такая пэрспэктыва, якая выклікае і ня можа ня выклікаць у кожнага бальшавіка, у кожнага перадавіка новы прыліў энэргіі, бадзёрасьці ў барацьбе і ўпэўненасьці ў перамозе» **(Постышаў).**

ЗА ШТО ПРЭМІЯВАНА КАМЕНСКАЕ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВА

Каменское сельспажыўтаварыства Лепельскага раёну абслугоўвае апорны Каменскі і Сушанскі сельсаветы.

Рост раздробнага таваразвароту па спажывецкай сыстэме БССР
За першую пяцігодку (у тыс. руб.)

Абслугоўваньне апорнага сельсавету павялічвае адказнасьць спажывецкай каапэрацыі і патрабуе сапраўды ўзорнай работы.

Гэта адказнасьць добра ўсьвядомлена кіраўніцтвам сельспажыўтаварыства. Метады працы Каменскага ССТ могуць зьяўляцца прыкладам для адсталых ССТ Лепельскага раёну. Сельспажыўтаварыства перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і дабілася значных посьпехаў у разгортваньні культурнага савецкага гандлю.

Сельспажыўтаварыства не чакала, па



Рост крамнай сеткі спажывецкай каапэрацыі БССР.
За першую пяцігодку (у адзінках)

куль спажывец прыдзе ў краму, яно таксама ўпарта адстойвала сваю самастойнасьць, сваю ініцыятыву ў выбары тавараў. Няма нічога дзіўнага ў тым, што плян таваразвароту за першы квартал выкананы на 166,7 проц., што перавыкананы заданьне другога квартału. Сельспажыўтаварыства разгарнула продаж тавараў шляхам развозак іх па калгасах, брыгадах і вёсках. Толькі за два месяцы зроблена 59 выездаў і прадана тавараў на 42.000 рубл. Пры гэтым трэба падкрэсьліць, **што развозкі лепшы тавар прадавалі перадавым ударнікам.**

Разгортваньне савецкага гандлю цесна зьвязана са становішчам фінансавай гаспадаркі. Адсюль вразумела значныя рэнтабэльнасьці працы, максымальнага скарачэньня выдаткаў звароту і поўнага выкананьня плянаў мабілізацыі сродкаў і каапераваньня.

Выдаткі звароту, якія ў лютым склалі 6,3 проц. у адносінах да звароту тавараў, даведзены да 4 проц., у выніку—прыбытак сельспажыўтаварыства складае 2,3 проц. да звароту. Плян мабілізацыі сродкаў за першы квартал выкананы на 166 проц.

Гэтыя посьпехі дасягнуты на аснове разгортваньня вялікай масавай работы сярод пайшчыкаў, ушчэпленьня каапэрацыйнага актыву ў гандлёвую дзейнасьць таварыства.



Разьвіцьцё грамадзкага харчаваньня па БССР.
За першую пяцігодку (колькасьць сталовак)

Вось чаму цэнтральная конкурсная камісія прэміявала Каменскае сельспажыўтаварыства, як адно з лепшых у сацспаборніцтве па абслугоўваньні пасеўнай.

Каменскія каапэратары павінны зараз мабілізаваць масы пайшчыкаў на абслугоўваньне поліва, уборкі і загатовак, дабіцца павышэньня тэмпаў таваразвароту, мабілізацыі сродкаў і каапераваньня.

Д. Іваноў.

Рост ліку пайшчыкаў спажывецкай каапэрацыі БССР
За першую пяцігодку (у тыс. чал.).



ЦІХІНІЦКАЕ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВА НА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ.
Фурманка з таварамі выяжджае на поле, ля чырвонай і чорнай дошкі, вывешаных у краме, рэдкалегія насьценгазэты ССТ за работай.

НА СЛУЖБЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

ЗРК машына-будаўнічага заводу імя Варашылава ўступіў у 1933 год з вялікімі прарывамі: пяўдалы падзел маемасьці пры разбуйненьні былога ЗРК металістаў, адсутнасьць на працягу амаль двух месяцаў пастаяннага старшыні праўленьня, слабая дапамога заводзкіх арганізацый, неўкамплектаванасьць апарату прывялі да рэзкага зьніжэньня таваразвароту і вялікага затаварваньня пяходкай прадукцыяй. Продаж тавараў за лютый зьнізіўся да 97.200 руб. супроць 154.000 руб. у студзені. Фінансавае станоўішча каапэратыву было вельмі цяжкім, рахункі своячасова не аплачваліся.

Аднак, у самы кароткі тэрмін, дзякуючы перабудове работы і актыўнай дапамозе партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыі заводу, ЗРК удалося ліквідаваць прарыў. **Ён уключыўся ў выкананьне баявога заданьня заводу па выпрацоўцы запасных частак.** Улічыўшы ўсё значэньне гэтага дзяржаўнага заданьня, ЗРК забясьпечыў палепшанае снабжэньне рабочых, якія працавалі па вырабе запасных частак. Ён арганізаваў дастаўку абедаў да варштатаў ядучым брыгадзірам. Многім рабочым былі выданы дадатковыя прадукты харчаваньня. **Гэтым самым ЗРК паставіў сваю работу на службу выкананьня вытворчых заданьняў.** Рабочыя заводу на справе адчулі, што ЗРК клапоціцца аб іх патрэбах, што ён перабудоўвае сваю работу.

ЗРК зьвярнуў вялікую ўвагу па разгортваньне самазагатовак. Паводле даўёка няпоўных вестак у першым квартале было загатоўлена 6.800 клг. мяса, у другім—6.200; сьвежай рыбы загатоўлена ў другім квартале 4.600 клг. Закуплены былі таксама сала, прадукты птушніцтва і малочныя прадукты.

ЗРК заключыў рад дагавораў з рай загамі і калгасамі, што забясьпечыла пасыпховае разгортваньне самазагатовак.

Строга прыпрымліваючыся прынцыпу падпарадкаваньня спабжэньня інтарэсам вытворчасьці, ЗРК забясьпечыў пераважнае снабжэньне лепшых ударнікаў і герояў пяцігодкі. У чэрвені ім выдана дадатковая, звыш нормы, сала, рыба, тварог, цукеркі і інш.

У адпаведнасьці з дырэктывамі партыі ЗРК заводу імя Варашылава не абмежаваў сваю дзейнасьць выдачай пайкоў. Дзякуючы ўдарнай рабоце, **удалося ліквідаваць лютаўскі прарыў у таваразвароце.** Работнікі першага магазыну ЗРК — важнейшай і рашаючай. гандлёвай адзінкі каапэратыву — абвясьцілі сябе мабілізаванымі на разгортваньне таваразвароту і добраахвотна павялічылі гадзіны гандлю. Работнікі ЗРК кінуліся на адшуканьне па-за плянавых хоўных тавараў патрэбнага асартымэнту. Дзякуючы гэтаму ўдалося выканаць сустрочны плян у 286 тыс. руб. (заданьне праўленьня — 260 тыс. рублёў) на 100 з лішнім процантаў. Уся сума па-за плянавых закупак у сакавіку складае 51.500 руб., у маі—71.400. Удзельная вага па-за плянавых закупак ва ўсім звароце ЗРК павялічылася з 47,3 проц. у сакавіку да 58 проц. у маі. Гэтыя лічбы гавораць аб **правільным курсе на пашырэньне гандлю.**

ЗРК рашуча змагаўся за ліквідацыю затаварваньня і памяншэньне таварных рэшткаў. Рэшткі тавараў па крамах на 1-ае красавіка складалі 98.000 руб., на першае мая—88,5 тыс., на першае чэрвеня 70,4 тыс. руб. Пераацэнкай няходкіх тавараў, перакідкай іх у іншыя магазыны, водпускам мэблі ў продыт ЗРК дабіўся зьніжэньня запасаў малаходкіх тавараў. Рэшткі мэблі зьменшыліся з 33,3 тыс. рублёў на 1-е студзеня да 14,5 тыс. руб. на 1-ае чэрвеня, а рэшткі жалеза-скабяных тавараў—з 19 тыс. руб. да 10 тыс. руб. Работнікі крам абвясьцілі рашучую барацьбу чартам і прыбыму брэку. Іх задача— **пераварваць крамы ў культурныя ачагі савецкага гандлю.**

ЗРК, дзякуючы дапамозе рабочых мас, з посьпехам правёў сяўбу і першае поліва ва ўласным каапгасе. Зараз заводзкія арганізацыі мабілізуюць рабочых на своячасовае і высокаякаснае правядзеньне другога поліва і ўборкі. ЗРК ужо рыхтуе тару і склады для загатовак гародніны.

Рашуча перабудавала сваю работу **сталоўка ЗРК**—цэх харчаваньня заводу імя Варашылава. Штат сталоўкі скарочан амаль на палову, пры гэтым абслугоўваньне рабочых ня толькі не пагоршылася, а нават палепшылася. Гэта дало магчымасьць ЗРК зьнізіць выдаткі па сталоўцы з 6.500 руб. у студзені да 5.000 руб. у маі, а таксама зьменшыць цану мясного абеду з 1 руб. да 80 кап. Гэта зьніжэньне зроблена за лік зьмяншэньня сабекошту пры паляпшэньні якасьці абеду.

Запытайцеся ў рабочых заводу аб якасьці абедаў, вы ад усіх пачуеце добрыя водгукі: «Наша сталоўка стала даваць больш смачныя абеды». Калі ў студзені колькасьць мясных блюд складала 48,9 проц. агульнай колькасьці, дык у маі яе мясных блюд павялічыўся да 81,4 проц. Ажывілася работа і буфэту, дзе зьявіўся кэфір, сыркі, пернікі, сьвежая гародніна.

Зараз заканчваецца пабудова новай кухні. Гэта дасьць магчымасьць яшчэ больш палепшыць абслугоўваньне варашылаўцаў.

Р. Р.

НА ДРУГІМ ЭТАПЕ

Веснавая пасеўная кампанія першага году другой пяцігодкі зьявілася баявым экзамэнам для спажывецкай каапэрацыі. Каапэрацыя павінна была на справе паказаць сваё ўменьне перабудаваць сваю работу тварам да калгаснай вытворчасьці, перанесьці ў поле цэнтр цяжару працы, па-баявому дапамагчы калгасам у барацьбе за заможнае жыцьцё.

Пасеўная кампанія зьявілася таксама экзамэнам для райсаюзаў, экзамэнам на гібкасьць, на ўменьне як мага лепш абслужыць нізоўку, ліквідаваць сапоўна-панскія метады кіраўніцтва работай сельспажыўтаварыстваў.

Падводзячы вынікі першага этапу ўсебеларускага конкурсу на лепшае сельспажыўтаварыства па абслугоўваньні пасеўнай, трэба перш-на-перш адзначыць, што **рад райспажыўсаюзаў і сельспажыўтаварыстваў здавальняюча вытрымалі экзамэн.**

Конкурс паказаў, якую вялізарную ролю можа адыграць каапэрацыя ў барацьбе за бальшавіцкія тэмпы сяўбы, тыя вялікія магчымасьці, якія закладзены ў падпарадкаваньні савецкага гандлю задачам уздыму с.-г. вытворчасьці.

Рад каапэрацыйных арганізацый паказалі ўзор таго, як трэба разгортваць савецкі гандаль, як трэба ўвязваць яго з барацьбой за сяўбу. Гэтыя каапэрацыйныя арганізацыі **пераварылі савецкі гандаль у магутны вагар барацьбы за выкананьне задач бальшавіцкай вясны.**

Ударнікам сацыялістычных палёў—ударнае снабжэньне

У перыяд пасеўнай кампаніі у радзе каапарганізацый былі ліквідаваны старыя каэфіцыенты снабжэньня, пабудаваныя на ўліку колькасьці насельніцтва. Завоз тавараў будаваўся ў залежнасьці ад ходу выкананьня плянаў пасеўнай кампаніі. **Хто ідзе ўперадзе па сяўбе як па колькасьці, так і па якасьці, той атрымлівае больш дэфіцытных тавараў.** Пад гэтым лёзунгам практычна зьяўляцца ўлялася тавараснабжэньне вёскі. **Каменскае сельспажыўтаварыства** Лепельскага раёну ў пачатку сяўбы атрымлівала 11,5 проц. усёй масы тавараў, якая адгружалася ў раён. У сувязі з тым, што сельсавет вышаў у першыя рады барацьбітоў за сяўбу, сельспажыўтаварыства ўжо атрымлівала 18,8 проц. усёй масы тавараў. Затое каэфіцыент адсталаму Валасоўскаму сельспажыўтаварыству быў зьніжан да 3,7 проц. за мест 57 проц.

Такія-ж метады работы практыкаваліся ў **Рагачоўскім** раёне. Каэфіцыент заводу тавараў Прыбарскаму сельспажыўтаварыству павялічыўся з 5,2 проц. да 11,6 проц., а Збароўскаму зьнізіўся з 2,8 проц. да 0,8 проц.

Заспаўскі райспажыўсаюз будаваў тавараснабжэньне ў залежнасьці ад таго, якое месца займае сельсавет у выкананьні плянаў сяўбы. Гарадзецкае сельспажыўтаварыства атрымала 16,4 проц. усіх тавараў, а **Гражаўскае — 4 проц.**

На аснове такіх-жа метадаў снабжаліся таварамі і крамы сельспажыўтаварыстваў. Завоз тавараў у пасосныя крамы поўнасьцю залежыў ад таго, як дапая вёска або калгас змагаліся за сяўбу. Крама ў сваю чаргу адпускала тавары ў залежнасьці ад колькасьці выпрацаваных калгаснікамі працадзён, ад выкананьня аднаасобнікамі сваіх абавязацельстваў.

„Куткі" ударнікаў і „паліцы" лодыраў

Новыя метады работы, якія разгарнуліся ў часе пасеўнай, значна ўзьнялі аўтарытэт і палітычную ролю нізавога зьвяна спажывецкай каапэрацыі і зрабілі вялізарны ўплыў на ход сяўбы.

Высачанскае сельспажыўтаварыства Лёзьнянскага раёну ва ўсіх крамах побач з куткамі ўдарнікаў, **якія** былі забясьпечаны лепшымі дэфіцытнымі таварамі, арганізавала «паліцу лодыраў», дзе былі другарадныя тавары.

Грэбенское сельспажыўтаварыства **Чэрвеньскага раёну** вызначыла востра дэфіцытныя тавары калгасу «КІМ», які ішоў упередзе па сяўбе. Калі сельспажыўтаварыства праверыла яго работу і выявіла, што сяўба праводзілася ў ад навор, тавар быў перадан іншым калгасам. Калгас «КІМ» не атрымаў тавараў, пакуль ня выправіў дапушчаных у часе сяўбы памылак, не палепшыў якасьці працы.

Такая сыстэма тавараснабжэньня значна стымулявала ўдарную працу на полёх і моцна біла па гультаёх і прагульшчыках. Лёзунг—«ударнікам ударнае снабжэньне», які стаў асноўным фактарам арганізацыі тавараснабжэньня, зьявіўся магутным вагаром уздыму тэмпаў сяўбы.

Паводле далёка няпоўных вестак, **у часе пасеўнай кампаніі было арганізавана 565 «куткоў» ударніка з лепшым асартымэнтам тавараў.**

Вопыт дзеньня раёнаў ушчэнт разьбіў апартуністычныя разважаньні аб немагчымасьці выканаць таваразварот у сувязі з новай сыстэмай тавараснабжэньня. Лічбы гавораць аб адваротным. За два месяцы—красавік і май—перадавыя райсаюзы і сельспажыўтаварыствы, увязаўшы савецкі гандаль з вытворчымі задачамі на вёсцы, дабіліся значных посьпехаў у разгортваньні **таваразвароту. Рагачоўскі райспажыўсаюз выканаў квартальны плян таваразвароту на працягу двух месяцаў на 75 проц., Ціхініцкае сельспажыўтаварыства на 162 проц., Слуцкі райспажыўсаюз 101 проц., Заблоцкае сельспажыўтаварыства на 110 проц.**

Гандаль набліжан да спажыўца

Для таго, каб наблізіць гандаль да спажыўца, адкрыт рад новых крам і ларкоў, разгорнута сетка развозак тавараў у поле, у калгасныя брыгады. Паводле даных 58 райспажыўсаюзаў, у часе пасеўнай кампаніі было адкрыта 188 новых крам, 110 ларкоў, арганізавана 570 развозак і разносак. Работа крам была прыстасавана да патрэб спажыўцоў. Як правіла, крамы былі адкрыты раніцай да выхаду ў поле, у часе абедзенага перапынку і ў часе звароту з поля.

Выезд развозак, у большасьці выпадкаў, быў зьвязан з праверкай ходу і якасьці сяўбы, з выяўленьнем ударнікаў і гультаёў.

Асноўнай базай работы крам зьявіліся **сацыялістычныя дагавары,** заключаныя сельспажыўтаварыствамі з калгасамі, калгаснымі брыгадамі і групамі аднаасобнікаў. Гэтыя дагавары мелі сваёй мэтай—падпарадкаваць таваразварот задачам уздыму вытворчасьці і выкананьня плянаў сяўбы. Яны адыгралі вялікую ролю, як магутны сродак павышэньня прадукцыйнасьці працы.

Масавая работа каапэрацыі—магутны вагар барацьбы за сяўбу

У часе веснавой сяўбы вопыт заключэньня сацдагавораў пашырыўся па многіх раёнах. Паводле даных 57 **райсаюзаў, было заключана 4800 дагавораў з калгаснымі брыгадамі, 50 з брыгадамі МТС і 1380 з групамі працоўных аднаасобнікаў.**

Сельспажыўтаварыствы правялі вялікую работу па арганізацыі буксірных брыгад для дапамогі адсталым саўгасам, калгасам і вёскам. Пабалаўскае сельспажыўтаварыства арганізавала дзьве буксірныя брыгады на дапамогу адсталым калгасам. Ціхініцкае сельспажыўтаварыства арганізавала буксірныя брыгады для дапамогі саўгасу і аднаасобнікам.

Вялікі ўплыў аказалі вывешаныя ў крамах **чырвоныя і чорныя дошкі,** якія адзначалі ударную працу і падсьпявалі адсталых. Паводле даных 38 райспажыўсаюзаў было арганізавана звыш 1.000 такіх дошак. Можна прывесьці шмат фактаў, якія характарызуюць вялікую ролю гэтых дошак у барацьбе за сяўбу.

Багушэўскае сельспажыўтаварыства занесла на чорную дошку калгас «Чырвоны Бераг». Гэта зрабіла вялікі ўплыў на калгаснікаў, якія па-баявому ўзяліся за работу і вышлі ў рады перадавікоў. Ёсьць рад фактаў, калі аднаасобнікі прыходзілі ў сельспажыўтаварыства прасіць, каб вылучылі работніка для праверкі якасьці іх працы.

Спажывецкая сыстэма павінна была дапамагчы калгасам у арганізацыі **грамадзкага харчаваньня** і забясьпячэньні сталовак і палявых кухань інвэнтарам. Трэба сказаць, што на гэту галіну работы каапэрацыйныя арганізацыі зьвярнулі мала ўвагі. Аднак, паводле далёка няпоўных даных было арганізавана ў часе сяўбы 300 сталовак, 84 палявыя качагі і 31 развозка гарбаты. Спажывецкія таварыствы прынялі актыўны ўдзел у снабжэньні ясьлёй неабходнымі прадуктамі. Паводле даных частка райсаюзаў, яны абслужылі 565 ясьлёй, адпусьцілі ім тавараў на 133 тыс. руб.

Вялікую роль адыграў **кніжны гандаль,** арганізаваны каапэрацыяй. Было адкрыта 9 кіёскаў, 133 кніжныя паліцы, рэалізавана літаратуры на 556 тысяч руб. Паводле даных 55 райсаюзаў, на полі працавалі 4250 калгаснікаў.

У часе конкурсу сельспажыўтаварыствы дабіліся значнай актывізацыі **нізавога друку.** Насьценгазэты сельспажыўтаварыстваў дапамагалі выяўленьню прагульшчыкаў і папулярызацыі вопыту лепшых ударнікаў.

Мы маем факты, калі сельспажыўтаварыствы выпускалі насьценгазэты пры кожнай краме. Апрача таго выпускаліся газэты на полі ў часе развозкі тавараў.

Паводле даных толькі 19 раёнаў выпушчана **153 насьценныя газэты.**

У выніку ўсебеларускага конкурсу рад сельспажыўтаварыстваў і райсаюзаў, перабудаваўшы сваю работу, адыгралі вялізарную ролю ў выкананьні плянаў сяўбы. **Калгасы, калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі на справе пераканаліся ў штодзённых клопатах ка впэрацыі аб ударніках пасеўнай.**

Баявыя задачы 2-га этапу

Першы этап ўсебеларускага конкурсу скончан. Падагульваючы вопыт работы перадавых каапэрацыйных арганізацый, трэба адзначыць, што частка райспажыўсаюзаў і сельспажыўтаварыстваў не ўсьвядомілі гэй адказнасьці, якую нясе каапэрацыя ў барацьбе за ўраджай. **17 раёнаў ня ўключыліся або фармальна ўключыліся ў конкурс.** Да іх адносяцца **Мазырскі, Чашніцкі, Петрыкаўскі, Ельскі, Гарадоцкі, Жлобінскі і Магілеўскі райсаюзы.** Яны не зрабілі канкрэтных вываду з пастановы ЦК КП(б)Б па дакладах двух ССТ Касьцюковіцкага раёну. Яны не перабудавалі сваёй работы і працавалі старымі асуджанымі метадамі.

Зараз спажывецкая сыстэма БССР не праходзіць на другі этап конкурсу — **на лепшае абслугоўваньне поліва, уборкі і загатовак.** Трэба на другім этапе за мацаваць і пашырыць выпрабаваныя метады барацьбы за сяўбу.

Неабходна заключыць сацыялістычныя дагавары на лепшую арганізацыю таваразнабжэньня, на поўнае выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў поліва, уборкі, аховы ўраджаю, маладзьбы і здачы прадукцыі дзяржаве.

Уся спажывецкая сыстэма павінна падпарадкаваць завоз тавараў задачам цасьпяховага правядзеньня поліва, уборкі і загатовак. Неабходна арганізаваць шырокую сетку развозак, палявых качагоў, сталовак і ясьлёй, забясьпечыўшы іх неабходным інвэнтаром і прадуктамі. Трэба шырока практыкаваць апрацоўшы сябе вопыт касавай работы—арганізацыю чырвоных і чорных дошак, выпуск насьценгазэт і кніжны гандаль на полі.

У часе загатовак пры кожным прыёмачным пункце павінны быць арганізаваны буфэты і чайныя, а пры буйных пунктах спэцыяльныя крамы.

Спажывецкія таварыствы павінны арганізаваць каапэрацыйныя сыгнальныя пасты для штодзённай праверкі выкананьня сацдагавораў.

Больш тавараў і лепшай якасьці — перадавым ударнікам поліва, уборкі і загатовак.

На другім этапе конкурсу каапэрацыйныя арганізацыі павінны энэргічна, настойліва змагацца за поўнае выкананьне плянаў тавараэвароту, мабілізацыі сродкаў, за савецкую палітыку цэн.

Ва ўсебеларускі конкурс павінны ўключыцца міжраённыя базы БКС, якія дагэтуль яшчэ не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі.

Асноўная ўмова посьпеху—ачышчань не спажывецкай каапэрацыі ад чужых, клясава-варожых, спэкуляцыцка-нэпманскіх элемэнтаў.

На другім этапе конкурсу поўнасьцю завяршым перабудову работы сельспажыўтаварыстваў—сапоўнага зьвяна гандлёвай сыстэмы.

ЧАВУСКІ, БАЎНАВЫЦКІ, БУТОМАЎ.

ВОДГУКІ ЗАМЕЖНАГА ДРУКУ НА ПАДПІСАНЬНЕ КАНВЭНЦЫІ 8-МІ ДЗЯРЖАЎ

„Канвэнцыя—моцная аснова для мірнага сужыцьця народаў"

ВАРШАВА, 3. (БЕЛТА). Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «міністар замежных спраў **Бэк** заявіў прадстаўнікам друку: «Я расцэньваю канвэнцыю аб азначэньні нападаючага боку, падпісаную сёньня Польшчай, Афганістанам, Эстоніяй, Латвіяй, Пэрсіяй, Румыніяй, Турцыяй і СССР, як значны палітычны акт які мае ў вышэйшай ступені канструктыўны характар. Ва Усходняй сыстэме рэгіянальных пактаў даная канвэнцыя становіць сабою сынтэз намаганьняў, накіраваных да сапраўднай арганізацыі міру. Гэаграфічны абэм канвэнцыі найлепшым чынам характарызуе яе палітычнае значэньне. Што-ж датычыць у прыватнасьці Польшчы, дык канвэнцыя зьяўляецца дёгічным вынікам сэрыі палітычных актаў, якія служаць базай для ўсё больш спрыяючага разьвіцьця польска-савецкіх адносін. Я маю тут на ўвазе маскоўскі пра такол 1929 г., датэрмінова увеўшы ў сілу пакт Келёга, а таксама пакт аб ненападзе і згоду аб прымірэнчай працэдуры, заключаныя Польшчай з СССР. Улічваючы, што паміж Польшчай і Румыніяй існуе саюз, а таксама улічваючы, польска-савецкія адносіны, наяўнасьць подпісу савецкай Расіі і Румыніі пад адным і тым жа палітычным актам побач з подпісам Польшчы дае нам падставу для асаблівага задаваленьня».

***

ВАРШАВА, 4. (БЕЛТА). Увесь польскі друк з задаваленьнем камэнтуе падпісаньне канвэнцыі 8 дзяржаў. Друк процішастаўляе гэту канвэнцыю, якая мае на мэце стварыць моцныя асновы да мірнага сужыцьця народаў на усходзе Эўропы,—пакту 4-х, які зьяўляецца крыніцаю непакою, зброяю рэвізіі граніц і падзелу дзяржаў на краіны першай і другой катэгорыі. Афіцыёз **«Газэта польска»**, падкрэсьліваючы, што канвэнцыя не парушае інтарэсаў трэціх дзяржаў піша: «У тым та і заключаецца значэньне канвэнцыі, што яна зьяўляецца крыцла дам таго, як можна ўшарадкаваць міжнародныя адносіны нават у шчыкатлівай сфэры бясьпечнасьці і бяз усякіх двусэнсасьцяй, а што яшчэ важней—без падзелу дзяржаў на краіны першага і другога рангу».

Падкрэсьліваючы садзейнасьць Польшчы у перагаворах аб заключэньні канвэнцыі, друк паведамляе аб узнагародзе прадстаўніка Польшчы ў савеце Лігі нацый **Рачынскага** высокім румынскім ордэнам у адзнаку яго заслуг у справе дыплёматычнага пасрэдніцтва паміж Румыніяй і СССР.

„Выдатная сыстэма забесьпячэньня бясьпечнасьці"

Н'Ю-ЁРК, 3. (БЕЛТА). Лёндансці карэспандэнт **«Ю'нінг пост»**, камэнтуючы канвэнцыю 8 дзяржаў, заяўляе: «Гэтым будзе завершана найбольш выдатная сыстэма дыплёматычнай бясьпечнасьці, створанае з часу сусьветнай вайны. Паколькі чалавечыя абяцаньні маюць наогул якое-небудзь значэньне, гэта сыстэма забясьпечвае Савецкі Саюз суверэн агрэсіі з боку Эўропы і з боку Азіі да Кітаю. **Літвінаў заслугоўвае вышэйшай адзнакі за свае дасягненьні.** У той час, калі французы, англічане і амэрыканцы спрачаліся аб валютным пытаньні, Літвінаў дагаварыўся аб прымірэньні з Англіяй. Ён атрымаў гэту перамогу не схіляючыся перад брытанскай «дыплёматыяй дубінак». Яму зараз удалося пабудаваць сыстэму ненападаў, на аснове якой Савецкі Саюз імкнецца агарадзіць сябе ў сьвеце, дзе вайна прадстаўляецца больш магчымай, чым калі-небудзь з часу вэрсальскай канфэрэнцыі».

***

ВЕНА, 3. (БЕЛТА). Заключэньне канвэнцыі паміж Савецкім Саюзам і 7 сумежнымі з ім краінамі жвава абмяркоўваецца у венскіх палітычных колах. **«Арбайтэр цэйтунг»** піша, што падпісаньне гэтай канвэнцыі азначае буйную перамогу Савецкага Саюзу.

Непакой германскага друку

БЭРЛІН, 4. (БЕЛТА). Германскі друк з дрэнна захаваным непакоем канстатуе, што лёнданская канвэнцыя аб азначэньні нападаючага боку, падпісаная Савецкім Саюзам і суседнімі з імі краінамі, зьяўляецца вялікай перамогай савецкай замежнай палітыкі. **«Кельніше цэйтунг»** піша: «Літвінаў можа быць даволен рэзультатамі сваіх перагавораў у Лёндане. Ён ня толькі ліквідаваў англа-савецкі канфлікт, але яму ўдалося таксама заключыць дагавор, які па свайму значэньню роўен дагавору аб ненападзе з заходнімі суседзямі СССР».

«Франкфуртэр цэйтунг» таксама падкрэсьлівае посьпех савецкай палітыкі, заўважаючы, што «Літвінаў умее зрабіць плённым свой удзел у міжнародных канфэрэнцыях». Газэта адзначае, што асновай гэтай палітыкі пактаў зьяўляецца шчырае імкненьне СССР да міру.

Ангельскі ўрадавы друк незадаволен

ЛЁНДАН, 4. (БЕЛТА). Ніводная з урадавых газэт не камэнтуе заключную ўчора канвэнцыю 8-мі дзяржаў. Гэта маўчаньне адценьвеацца як адзна ка неадзавальненьня, паколькі канвэнцыя прабівае новую расколіну («брешь») ў плянах антысавецкага блёку. Апазіцыйны друк вітае канвэнцыю. **«Н'юс Кронікль»** расцэньвае яе, як «надавычай важную перамогу ў інтарэсах міру, здаровага розуму».

«Манчэстар гардыян» указвае на вялізарны дыплёматычны посьпех тав. **Літвінава** і адзначае вялікае значэньне канвэнцыі для міру ва ўсходняй Эўропе. **«Дэйлі Геральд»** называе канвэнцыю «дакумэнтам найвялікшага значэньня» у прыватнасьці таму, што яна ў некаторай меры азначае адказ усходня-эўрапэйскіх дзяржаў на пагрозу заняволеньня в боку заходніх дзяржаў на аснове пакту 4-х.

Частковае скасаваньне англа-японскага гандлёвага дагавору

Токіё, 4 (Белта). Ангельскі ўрад нанёс новы ўдар па японскім экспарце, спыніўшы дзеяньне англа-японскага гандлёвага дагавору ў наступных ангельскіх калёніях: **Нігерыя, Залаты Берег, Гамбія і Сьера Леонэ.**

Польская газэта аб сялянскіх выступленьнях на Зах. Украіне

ВАРШАВА, 3. (Белта). «КУР'ЕР ПОРАНЫ» паведамляе, што ў рэзультаце рассьследваньня ўладамі крывавых сутычак паміж сялянамі і паліцыяй у ЛАНЦУЦКІМ павеце—РУХАМ СЯЛЯН КІРАВАЛА ЛЕВАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ «САЛЯНСКАЯ САМАДАПАМОГІ». Ґа зэта піша, што рух быў настолькі арганізаваны, што ПРАЦАВАЛА НАВАТ СПЭЦЫЯЛЬНАЯ СЛУЖБА СУВЯЗІ ПА МІЖ ПААСОБНЫМІ ВЁСКАМІ з тым, каб выклікаць выступленьні адначасова ў розных мясцох.

Гутарка тав. Літвінава з карэспандэнтам „Н'юс Кронікл"

ЛЁНДАН, 5 (Белта). Лібэральная «Н'ЮС КРОНІКЛ» друкуе на відным месцы інтэрв'ю КЕМНГСА з тав. ЛІТВІНАВЫМ. Ва ўступнай частцы Кемгс заяўляе: «Ліквідацыяй англа-савецкага канфлікту і заключэньнем пактаў аб ненападзе тав. Літвінаў значна ўзьняў савецкі прэстыж у любой частцы сьвету». Тав. Літвінаў заявіў, што савецкі ўрад зрабіў усё магчымае для садзейнасьці сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі, хоць ад канфэрэнцыі нічога не чакаў.

«Адной з прычын няўдачы канфэрэнцыі, заявіў тав. Літвінаў, зьяўляецца тое, што амаль кожная краіна, пасылаючы сваю дэлегацыю ў Лёндан, спадзявалася заключыць выгадную для сябе зьдзелку. Тав. Літвінаў дадаў, што ён ня верыць у зьніжэньне тарыфаў, ці ў тое, што скарачэньне тарыфаў можа даць выгоды. Важна, сказаў тав. Літвінаў, знайсьці шляхі да павялічэньня аб'ёму сусьветнага міжнароднага гандлю, знайсьці рынкі, павялічыць вытворчую магутнасьць прадпрыемстваў і устанавіць, якія краіны могуць павялічыць свой імпарт і на якіх умовах».

На пытаньне, што можа быць зроблена ў часе адтэрмінаваньня сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі, тав. Літвінаў адказаў, што няма ніякіх іншых сродкаў для міжнароднай акцыі і што магчыма толькі акцыя групы краін, аднак, ён ня выказваецца на карысьць такіх груповак, якія азначаюць свайго роду вайну. Далей тав. Літвінаў указаў, што ад імя СССР ён прапанаваў даць штуршок разьвіцьцю гандлю, шляхам значнага павялічэньня савецкіх заказаў за межамі. «Мы не займаемся аднымі толькі размовамі аб гандлі. Мы рабілі прапанову ў інтарэсах усіх кран, уключаючы сваю ўласную краіну. Аднак, калі гэта будзе неабходна, дык наша разьвіцьцё можа ісьці па самастойным шляху».

Далей тав. Літвінаў заявіў, што ён задаволен адмаўленьнем перагавораў з мэтаю заключэньня новага англа-савецкага гандлёвага дагавору. «Аднак,—гаворыць далей тав. Літвінаў—мы прыдаем жыцьцёва-важнае значэньне таму, каб нашы адносіны з Брытаніяй былі вольны ад пастаяннай пагрозы быць перарванымі з прычын палітычнага характару. Вопыт апошніх гадоў і месяцаў паказаў нам, шот такія перары вы аказваюць псыхапэгічны ўплыў на наш народ. Якім чынам можам мы прыняць доўгатэрміновыя абавязацельствы ў адносінах да прамысловых фірм, калі не атрымаем некаторага запэўненьня адносна палітычнага спакою і стабільнасьці?»

У заключэньне тав. Літвінаў указаў, што пры выпрацоўцы тэксту новага дагавору ўсякая спроба ўстанаўляць дыскрымінацыю ў адносінах СССР, аль бо стварацъ для яго перашкоды, будзе адхілена.

Аб становішчы саўгасу Банонь

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б па дакладу начальніка палітаддзелу тав. Макеева

ЦК адзначае, што палітаддзел саўгасу Банонь за параўнальна кароткі тэрмін сваёй работы ўскрыў рад фактаў злачыннай безгаспадарчасьці з боку дырэкцыі саўгасу (дрэнны рамонт трактараў, нявываз на поле гною, дрэнны догляд каня і г. д.), засьмечанасьці клясава-чужымі элемэнтамі (вычышча на каля 30 чалавек б. афіцэраў, памешчыкаў, кулакоў, жандараў і інш.); наяўнасьць шкодніцтва, накіраванага да зьнішчэньня пагалоўя сьвіней (за 6 месяцаў адыход маладняка — 550 штук), злодзейства (раскрадзена за 1932-33 г. 36 пудоў масла) і г. д.; выключную засьмечанасьць партыйнай ячэйкі чужымі, разлажыўшымися элемэнтамі, страту клясавай і партыйнай пільнасьці з боку партыйнай ячэйкі і членаў партыі, прычым з боку дырэкцыі саўгасу палітаддзел у сваёй рабоце сустракаў яўнае супраціўленьне.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Дырэктара саўгасу ДАВІДОВІЧА К. М. з работы зьняць і аддаць пад суд, прыняўшы да ведама паведамленьне, што камісіяй па чыстцы Полацкага раёну Давідовіч выключан з партыі.

2. Прапанаваць Упаўнаркамсаўгасу: а) у трохдзённы тэрмін камандіраваць у саўгас вэтдоктара і зоатэхніка; б) сумесна з аршанскім трэстам забясьпечыць саўгас нехапаючым уборачным інвэнтаром (конная касарка, трактарная снопавязалка) і запаснымі часткамі да сельгасінвэнтару;

в) у трохдзённы тэрмін ліквідаваць запазычанасьць па зарплаце ў саўгасе Банонь (50.000 руб.).

3. Указаць аршанскаму Сьвінаводтрэсту на адсутнасьць з яго боку эпэрацыйнасьці ў кіраўніцтве саўгасам Банонь і дапушчэньне няправільнага, мяжуючага са шкодніцтвам, плянаваньня завозу кармоў і харчоў саўгасу. Прапанаваць тав. ЖОЛУДАВУ расьсьледваць гэтыя факты і пакараць вінаватых.

4. Абавязаць Белкаапсаюз у трохдзённы тэрмін вырашыць пытаньне аб старой запазычанасьці рабкопу саўгасу Банонь, атрыманай пры рэарганізацыі сельспажыўтаварыства, і мерапрыемствах для далейшага ўмацаваньня і крэдытаваньня рабкопу.

5. Прапанаваць ЦП РЖС тав. КРАЎЧАНКА ў трохдзённы тэрмін вырашыць пытаньне аб водпуску сродкаў на пабудову клюбу ў саўгасе.

Указаць Полацкаму РК КП(б)Б на адсутнасьць з яго боку канкрэтнага кіраўніцтва саўгасам Банонь і партыйнай ячэйкай.

6. Прапанаваць Полацкаму РК КП(б)Б узмацніць канкрэтную дапамогу саўгасу ў яго рабоце. Прыняць да ведама паведамленьне тав. Макеева аб тым, што камісіяй па чыстцы з 17 членаў і кандыдатаў партыі выключаны 11 членаў і кандыдатаў партыі, а іх 4 члены бюро ячэек КП(б)Б.

Лічачы правільнымі мерапрыемствы палітаддзелу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні саўгасу, ЦК звяртае ўвагу работнікаў палітаддзелу і ячэйкі на неадкладную падрыхтоўку да ўборкі і здачы збожжа, а таксама іншай прадукцыі ў тэрмін і поўнасьцю, стаўшы прыкладам па выкананьні дзяржаўных абавязацельстваў для вакольных саўгасаў.

Як „Палеская праўда" арыентуе збожжаздатчыка

«Першымі ў раёне здамо збожжа дзяржаве»—пад такім загалоўкам дае «Палеская праўда» лист вытворчай нарады калгасу імя Леніна, Пакалюбіцкага сельсавету («П. П.» ад 13/VI). Вось адзін з пунктаў гэтага ліста:

«Наш плян здачы збожжа дзяржаве мы выканаем першыя ў раёне, мы проста з-пад малатарні здамо дзяржаве... Для лепшай і хутчэйшай здачы выдзяляем 15 коняй, збожжа адвязем за 10 дзён, да Кастрычніцкіх сьвят поўнасьцю разьлічымся з дзяржавай».

«Палеская праўда» робіць вялікую справу, мабілізуючы ўжо зараз масы калгаснікаў і аднаасобнікаў на першачарговае выкананьне іх абавязкаў перад дзяржавай. Але, зьмясьціўшы гэты лист, ня ўдумаўшыся ў яго сутнасьць, газэта дапусьціла яўнае скажэньне дырэктыў партыі і ўраду.

Хто дазволіў «Палескай праўдзе» арыентаваць масы на зацягваньне тэрміну здачы збожжа. Такая арыентацыя, устаноўка на здачу збожжа да лістапада, замест выкананьня пляну на працягу жніўня і верасьня грае толькі на руку клясаваму ворагу.

Работнікі рэдакцыі фармальна, пачыноўніцку падышлі да падачы такога адказнага матэрыялу, як выклік калгасу імя Леніна і гэтым фактычна дапамаглі мацнэйшым кулацтву, накіраваным на зрыў кампаніі.

У нумары ад 14 чэрвеня «Палеская праўда» ня толькі ня ўскрывае гэтай памылкі, але, наадварот, замазвае яе. Яна зьмяшчае адказ калгасу «Чырвоны хлебароб» на ліст калгасу імя Леніна, дзе літаральна сказана:

«У вашым лісьце ёсьць некаторыя недагаворкі, памылкі. Так, нічога ня сказана пра касавіцу, не пакаданы тэрміны поліва за якія вы будзеце змагацца, не паказана, колькі раз і як вы будзеце рабіць поліва».

Аб галоўнай агульнай памылцы ў гэтым адказе няма ні слова, не не заўважыў калгас «Чырвоны хлебароб», ае не заўважае і рэдакцыя. Газэта замацоўвае сваю «ўстаноўку»:

«Таварышы калгаснікі калгасу імя Леніна, ваш выклік на спаборніцтва мы прымаем, усе высунутыя ў лісьце пункты спаборніцтва будуць і нашы».

Так «Палеская праўда», «мабілізуе» калгаснікаў на выкананьне здачы збожжа.

Мала гэтага. На зьлёце ўдарнікаў веснавой сяўбы Пакалюбіцкага сельсавету 17-га чэрвеня брыгадзір калгасу імя Леніна тав. Каржоў заявіў:

«Мы выправілі сваю памылку, да пушчаную намі ў сваім лісьце да ўсіх калгасаў раёну. Там мы ня ясна ўказалі тэрміны здачы збожжа дзяржаве, зараз ад імя калгасу заяўляю —за 20 дзён пасьля пачатку ўборкі здамо збожжа дзяржаве».

Тав. Каржоў даволі мяжка кваліфікаваў яўна кулацкую ўстаноўку, дапушчаную ў лісьце, але тое, што нават і ён заўважыў, «прапляшіла» газэта. Яна супакоілася на тым, што надрукавала заяву Каржова. Яна не зрабіла з гэтага палітычных высноваў, не дала разгорнутай самакрытыкі дапушчанай грубай палітычнай памылкі.

Дэзарыентацыя здатчыкаў на гэтым ня спынілася. У нумары ад 18 чэрвеня «Палеская праўда» зьмяшчае артыкул пад назвай «Вопыт Веселокукцкай МТС у дзеяньні». У гэтым артыкуле газэта піша:

«Ліст калгасу імя Леніна, сацыялістычныя нарады пры МТС, у якіх знашлі сабе канкрэтнае праламленьне дырэктывы партыі і ўраду—вось вялізарныя палітычныя дакуманты, па якіх вясковая арганізацыі, партячэйкі і сельсаветы павінны мабілізаваць масы калгаснікаў на бавое завяршэньне сельска - гаспадарчага году».

Так «Палеская праўда» кваліфікуе лёзунг аб поўным разьліку в дзяржавай да Кастрычніцкіх сьвят, г. зн. да лістапада. Лёзунг, які агідна скажае дырэктывы партыі і ўраду, яна рэкамэндуе ў якасьці вялізарнага палітычнага дакуманту, на аснове якога трэба мабілізоўваць масы калгаснікаў.

Дзіка знайсьці прыклад большай палітычнай сьлепаты!

Нават і пасьля выступленьня тав. Гікало на нарадзе сакратароў райкомаў і памаралітаддзелаў па камсамольскай рабоце, у якой выразна падкрэслена, што «трэба арыентаваць кожнага калгасьніка на тое, што збожжазагатоўкі павінны быць скончаны ў жніўні і верасьні месяцы» (прамова тав. Гікало надрукавана ў «Палескай праўдзе»), «П. П.» ня выступила з крытыкай сваіх памылак, з выкрыцьцём дапушчанай ёю няправільнай глыбока-памылковай арыентацыяй калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. Яна нават 24 чэрвеня, пасьля прамовы тав. Гікало надрукавала інфармацыю аб тым, што

«сход калгаснікаў-ударнікаў Карналінскага сельсавету сумесна з перадавымі аднаасобнікамі прыняў вызклік калгасу імя Леніна на лепшае і хутчэйшае правядзеньне ўборкі і на датэрміновае выкананьне сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай».

І тут газэта не сказала ні аднаго слова аб памылках у лісьце калгасу імя Леніна, не ўказала, у якім тэрміны сход карналінскіх калгаснікаў абавязваецца здаць збожжа дзяржаве з тым, каб заваяваць пярэдніцтва ў раёне, а проста зафіксавала ўрачыстую дэкларацыю.

27-га чэрвеня бюро гаркому, разгледзеўшы гэта пытаньне, рашуча асудзіла памылкі газэты, якая арыентавала на працягу двух тыдняў масы на позьнія здачы збожжа дзяржаве. Бюро дало рад практычных указаньняў рэдакцыі для выпраўленьня памылак.

Падрыхтоўка да 13 гадавіны вызваленьня БССР ад белапалякаў

*** ПУСК НОВАЙ ВАДАПРАВОДНАЙ СТАНЦЫІ Ў НАВІНКАХ** адбудзецца ў дзень сьвяткаваньня 13-й гадавіны аслабаненьня Беларусі ад белапалякаў.

12-га ліпеня ў Жодановічах на гарадзкой палітмасоўцы, прысьвечанай гадавіне аслабаненьня Беларусі ад белапалякаў, Менскімі фізкультурнікамі будуць арганізаваны спаборніцтвы па воднаму спорту, футболу (сустрэча Менск — Харкаў), валейболу і інш. Фізкультурнікі нападзяць атракцыёны і масавыя гульні разам з усімі ўдзельнікамі палітмасоўкі.

*** Дзяржаўная бібліятэка і бібліяграфічны інстытут БССР да 13-й гадавіны** аслабаненьня Беларусі ад белапалякаў рыхтуе вялікую **КНІЖНА-ЛІТАРАТУРНУЮ ВЫСТАЎКУ**, якая адлюструе моманты белапольскай акупацыі, розныя этапы барацьбы за вызваленьне БССР ад белапалякаў, пасьляховае сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай рэспубліцы і сучаснае становішча ў Заходняй Беларусі.

***** Менскі гарсавет Асоавіяхіму да 11-га ліпеня арганізуе ў гарадзкім садзе «Прафінтэрн» выстаўку па стратэгічнай і хэмічнай справе.

Культурнае абслугоўваньне рабочых новабудоўляў

Палітасьветны сэктар Наркамасьветы БССР заключыў дагавор з ЦП саюзаў прамжылбудаўніцтва на культурна-масавае абслугоўваньне рабочых новабудоўляў. На гэту мэту адпушчана каля 115 тыс. рублёў.

У Менску, Гомелі, Віцебску, Рэчыцы, Полацку і іншых раёнах на новабудоўлях арганізуецца 17 чырвоных кутко́ў, 15 школ па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Для работы ў гэтых школах выдзелена 30 настаўнікаў. Створаны дзьве агітмастацкія брыгады. Адначасова арганізуецца 20 бібліятэк-перасовак і 10 кіно-перасовак.

Папярэджаньне раёнам, якія не прадставілі кандыдатуры для прэміяваньня

Цэнтральная камісія па спаборніцтве з Заходняй вобласьцю папярэджвае партыйнае, савецкае кіраўніцтва раёнаў **Магілеўскага, Заслаўскага, Дзяржынскага, Мазырскага, Аршанскага, Рэчыцкага, Жытнавіцкага, Жлобінскага, Чашніцкага, Крычаўскага, Глускага, Талочынскага, Лоеўскага, Асіпавіцкага, Хойніцкага, Вушацкага, Ельскага і Брагінскага**, якія ня гледзячы на неаднаразовы напамін аб вылучэньні кандыдатур для прэміяваньня лепшых калгасоўнікаў, брыгадзіраў і працоўных аднаасобнікаў за веснавую сяўбу, да гэтага часу гэтых кандыдатур ня вылучылі, і што неназначэньне кандыдатур да пачатку Ўсебеларускага зьезду калгаснікаў ударнікаў пазбавіць гэтыя раёны прэміяваньня, аб чым будзе да ведама зьезду.

Старшыня цэнтральнай камісіі па спаборніцтве з Заходняй вобласьцю КАРТУКОЎ.

На зьлёце калгасьніц-ударніц Меншчыны

Учора адкрыўся Менскі раёнзьлёт калгасьніц-ударніц. Адкрываючы зьлёт, сакратар Менгаркому КП(б)Б тав. **Кудзелька** на заклікаў калгасьніц шырока разгарнуць крытыку тых недахопаў, якія ёсьць у калгасах, выкрыць недахопы праполачных работ, падрыхтоўкі да ўборачнай. Тав. Кудзелька, падрабязна расклумачыўшы сутнасьць сёлетняй загатоўчай кампаніі і адачы сельска-гаспадарчых прадуктаў дзяржаве, заклікаў калгасьніц быць у перадавых радах барацьбітоў за свайчасовае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай, быць першымі ў барацьбе з кулацкімі, клясаварожымі элемэнтамі.

Асноўны дакладчык зьлёту тав. **Каранеўскі** разгарнуў перад дэлегатамі шырокае палатно тэй барацьбы, якая была праведзена ў Меншчыне за час веснавой сяўбы. Практыка гэтай барацьбы дае шмат урокаў для далейшай працы за высокі ўраджай калгасных палёў, за гаспадарча-палітычнае ўмацаваньне калгасу.

Тав. Каранеўскі браў прыклады з самых горшых калгасаў, якія прававалі сяўбу («Прагрэс», «Зьвязда», імя Молатава, «Чырвоная ніва» і імя Дзяржынскага, прыгарадны калгас імя Сталіна і іншыя) і паказаў дэлегатам як трэба да канца вычышчаць калгас ад кулацкіх элемэнтаў, як трэба растлумачваць калгаснікам, што толькі ад іх саміх залежыць вараз моц калгасу.

Ажывілася ўся заля, калі тав. Каранеўскі прыпёр, як кажуць, да сьценкі калгасы прыгароднага сельсавету.

— Там — гаворыць тав. Каранеўскі— хваліцца што сёлета будзе добры ўраджай. А вярней будзе, што ім трэба хваліцца... сьвірэпкай. Сьвірэпка жоўтым колерам агарнула палі, коле вочы кожнаму, хто прыяжджае ў Менск. Там і дагэтуль думаюць што сьвірэпка —натуральная зьява і павінна жыць век.

Тав. Каранеўскага ў яго патрабаваньні ад калгасаў прыгароднага сельсавету **зьмяніць жоўты колер палёў на зялёны**, зараз-жа вырваць з карэньнем сьвірэпку—дружна падтрымалі дэлегаткі.

Мы павінны зьняць з нашых палёў абожжавых ня менш 9 цэнтн. з га і бульбы ня менш 115 цэнт. з га. А каб гэтага дабіцца, трэба перш за ўсё вызваліць калгасныя палі ад пустазельля, ад сьвірэпкі.

Сур'ёзную ўвагу зьлёт зьвярнуў на пытаньні свайчасовай касьбы і сенаўборкі. Апошнюю трэба скончыць 10 ліпеня. Між тым па Меншчыне раёне скончыў касьбу толькі адзін Навадворскі сельсавет.

Пытаньні ўборкі занялі шмат увагі зьлёту. Сёлетняя ўборка абожжавых будзе адбывацца разам, што патрабуе асабліва старанная падрыхтоўкі.

Зьлёт абгаварыў і пытаньні працоўнай дысцыпліны ў часе ўборачнай кампаніі.

—Мы цяпер ужо можам падлічыць, колькі кожны калгаснік атрымае ад ураджаю. Цяпер ужо трэба ставіць пытаньне аб тых, хто на працу ня ходзіць, хто не працуючы спадзяецца нешта атрымаць ад калгасу.

Дэлегатка **Струт** (прыгарадны калгас «Чырвоны гарод») проста заявіла.

— Працаваць, пазіраючы на сонейка,—выгодна толькі кулаку. Нічога ня выйдзе, калі мы будзем так працаваць. Мы, ударніцы, ня толькі самі не павінны выходзіць з поля, але і іншых за сабой цягнуць. Вось як трэба будзе пра водзіць уборку.

З дэталёва выпрацаванымі рапартамі баявых палявых работ выступілі дэлегаткі **Всраць, Труцкая, Баталевіч**, асабліва заваструўшы увагу зьлёту на неабходнасьці барацьбы за працоўную дысцыпліну, за добрую расстаноўку рабочай сілы.

Пра забесьпячэньне касірамі і рахунковымі кадрамі прыпісных кас загатпунктаў „Загатзбожжа" на час хлебазагатоўчай кампаніі

Пастанова Народнага Камісарыяту Працы БССР

4-га ліпеня 1933 г. **№ 26** **гор. Менск.**

На падставе пастановы Савету Народных Камісараў БССР **за 26-VI—1933 г. № 923 «аб арганізацыі прыпісных кас на загатпунктах «Загатзбожжа» на час хлебазагатоўчай кампаніі 1933 г.**

Народны Камісарыят Працы БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усіх раённых і гарадзкіх інспэктароў працы на працягу 5-ці дзён з моманту выданьня гэтае пастановы забясьпечыць прыпісныя касы загатпунктаў „Загатзбожжа" касірамі і рахунковымі кадрамі, у адпаведнасьці з устаноўленымі штатамі загатпунктаў на час хлебазагатоўчай кампаніі 1933 году, накіраваўшы на загатпункты наступных работнікаў:

НАЗВА РАЁНУ	Назва прыём. пункту	Бухгальтар	Рахункавод	Касіры	НАЗВА РАЁНУ	Назва прыём. пункту	Бухгальтар	Рахункавод	Касіры
Менскі	гор. Менск	1	1	2	Жлобінскі	Салтанаўка	—	—	2
Пухавіцкі	Пухавічы	—	1	2	„	Чырвоны Бераг	—	—	2
„	Рудзенск	—	—	2	„	Стрэшан	—	—	2
Койданаўскі	Койданава	1	1	2	Рагачоўскі	Рагачоў	—	1	2
„	Негарэлае	—	—	2	Парыцкі	Парычы	—	1	2
Заслаўскі	Беларусь	1	—	2	„	Шапілкі	—	—	2
Смалявіцкі	Смалявічы	1	1	2	Глускі	Рахміравічы	—	1	2
Магілеўскі	Магілеў	1	1	2	Асіпавіцкі	Асіпавічы	1	1	2
„	Друць	—	—	2	„	Градзянка	—	—	2
Шклоўскі	Шклоў	—	—	2	Мазырскі	Мазыр	—	—	2
Быхаўскі	Быхаў	1	—	2	„	Калінкавічы	1	—	2
Чавускі	Чавусы	1	—	2	„	Халоднікі	—	—	2
„	Рэста	—	—	2	Ельскі	Ельск	1	—	2
Клічаўскі	Несята	1	—	2	Нараўлянскі	Нароўля	1	—	2
„	Мілое	—	—	2	„	Дзярновічы	—	—	2
Прапойскі	Прапойск	1	—	2	Жыткавіцкі	Жыткавічы	1	—	2
Аршанскі	Орша	—	—	2	Тураўскі	Тураў	1	—	2
„	Багушэўск	—	—	2	Пятрыкоўскі	Капцэвічы	1	—	2
Дубровенскі	Краснае	—	—	2	„	Піч	1	—	2
Сеньненскі	Бурбін	—	1	2	Мазырскі	Кацуры	—	—	2
Талачынскі	Талачын	—	1	2	Барысаўскі	Барысаў	1	—	2
„	Слаўнае	—	1	2	Бярэзінскі	Бярэзіна	1	—	2
Лепельскі	Лепель	—	1	2	Крупскі	Крупкі	1	—	2
Мсьціслаўскі	Ходасы	—	1	2	Бягомльскі	Мсьціж	1	1	2
Горацкі	Горкі	—	—	2	Клімавічы	Клімавічы	—	1	2
„	Цёмны Лес	—	—	2	Крычаўскі	Крычаў	1	—	2
Чашніцкі	Чашнікі	—	1	2	Касьцюковічы	Камунары	—	—	2
„	Вятна	—	1	2	„	Бялынічы	—	—	2
Бабруйскі	Бабруйск	—	1	2	Чэрыкаўскі	Верамейкі	—	—	2
Жлобінскі	Жлобін	—	1	2	Рэчыцкі	Рэчыца	1	1	2
Хойніцкі	Хойнікі	1	—	2	„	Васілевічы	—	—	2
Сураскі	Сураж	—	1	2	Лоеўскі	Лоеў	1	—	2
Брагінскі	Бакі	—	1	2	Гомельскі	Гомель	—	1	2
Полацкі	Полацак	—	1	2	„	Дзетлавічы	—	—	2
„	Дрэтунь	—	—	2	Церахаўскі	Церахоўка	—	1	2
Дрысенскі	Дрыса	—	—	2	Б.-Кашалёўскі	В-Кашалева	—	1	2
Расонскі	Расоны	—	—	2	Уваравіцкі	Ст. Уза	—	1	2
Дрысенскі	Боркавічы	—	—	2	Камарынскі	Іолча	—	1	2
„	Бігосава	—	—	2	„	Пасудава	—	—	2
Слуцкі	Слуцак	1	1	2	„	Камарын	—	—	2
„	Урэчча	—	1	2	Чачэрскі	Чачэрск	—	1	2
Ст. Дарожскі	Ст. Дарогі	—	—	2	Чачэрскі	Гарадоўка	—	—	2
Слуцкі	Пасталы	—	—	2	Веткаўскі	Ветка	—	1	2
Віцебскі	Віцебск	1	—	2	Кармянскі	Карма	—	1	2
Гарадоцкі	Гарадок	—	—	2	Лёзьнянскі	Лёзна	1	—	2
„	Язэрышча	—	—	2	„	Крынкі	—	—	2
„	Вычыха	—	—	2	Бешанковіцкі	Бешанковічы	—	1	2
Сіроцінскі	Шуміліна	—	1	2					
					УСЯГО:		27	36	190

2. Накіраваньне работнікаў на Загатпункты вытварыць шляхам перадачы кваліфікаваных работнікаў паказаных спэцыяльнасьцяй з іншых гаспадарчых арганізацый.

Пэрсанальны адбор работнікаў вытварыць спэцыяльнай камісіі ў складзе інспэктара працы, заг. загатпункту і кіраўніка райбанку.

Л. Абавязаць камісію ўсю работу па адбору і накіраванню працаўніўніць Народнаму Камісарыяту Працы БССР зводку аб выкананьні заданьня.

ЧВА Народнага Камісара Працы БССР **ЮЗЭФ.**

Нам. нач. сэктару кадраў і працдысцыпліны НКПВ **РАСКІН.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

7-VII-33 г. а 3-й гадзіне дня ў памяшканьне ГК КП(б)Б, у пакой № 48 выкліканцца дырэктары наступных прадпрыемстваў: МРВ, цэга заводу імя Мясьнікова, аксэлёсатацы, ДПА, шляху, «Кастрычнік», заводу «Камунар», фабрыкі імя Крупскай, заводу імя Молатава, «Вальшавік», імя Варашылава, абутковай фабрыкі.

Яўка абавязкова і без спазьненьня

Менгарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказны рэдактар—21-353; сакратарыят—21-354, сэктары: сельска-гаспадарчы і нац.-культур нага будаўніцтва—21-356; партсэктар—21-352; сэктары: прамысловы, савецкага будаўніцтва і снабжэньня камэрцыі і нас нап.—21-350; транспартны сэктар і бюро расьсьледваньня—21-355; машыннае бюро—21-351; загадчык выдавецтва і аддзел абвестак—21-358; вучотна-тыражны сэктар—21-350; кантора выдас.—21-685; друкарня—21-357

Менск, друкарня «Зьвязды» Галоўлітбел № 337.

Антысавецкія інтрыгі германскіх блазнаў і японскіх імпэрыялістаў

ЛЁНДАН, 4. «Дэйлі Геральд» друкуе